БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЕЖНАЯ ГАЗЕТА

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

17 верасня 1994 г.
Субота
№ 102(13819)
Кошт у розніцу 10 рублёў
Выдаецца з 1921 года

У НУМАРЫ:

"ПОЗНЕСАВЕЦКІ РЭКВІЕМ". Метамарфозы нашай рэчаіснасці. 2

"МАЛЕНЬКАЯ ПРАБЛЕМА, ШТО СТАЛА АМАЛЬ ДЗЯРЖАЎНАЙ". Хто апране нашых дзяцей? 2

"БЫЛОЕ І ДУМЫ". Гісторыя маленькага гарадка. 2

"9x12". Наш госць — Мішэль ЛЕГРАН. 3

"ОПТЫМА" – ЗНАЧЫЦЬ ЛЕПШЫ". Як зберагчы наша здароўе. 3

Малюе Віктар ДУБОВІК

У Баранавіцкім аэраклубе спортам смелых і дужых займаецца больш як 250 чалавек. Скачкі з парашутам — толькі для мужных, моцных целам і духам!

Фота Эдуарда КАБЯКА, БЕЛІНФАРМ.

Кур'ер "ЧЗ"

Дзень аб'яднання беларускага народа

Пасля нападу на Польшчу фашысцкай Германіі Чырвоная Армія распараджэннем урада ад 17 верасня 1939 года ўзяла пад ахову насельніцтва Заходняй Беларусі. У кастрычніку адбыўся народны сход Заходняй Беларусі, які прыняў дэкларацыю аб уключэнні гэтага рэгіёна ў саставу БССР.

Ці адбудуцца выбары 18 лістапада 1994?

Выбары ў Вярхоўны Савет Беларусі адбудуцца яшчэ сёлета, хутчэй за ўсё, яны будуць назначаны на 18 лістапада 1994 года. Да такога выраду прыйшлі спецыялісты сацыялагічнай лабараторыі "Экумена" партыі падтрымкі СНД.

Спецыялісты "Экумены" таксама выказалі здагадку, што на палітычную сцэну выйдзе сталая, падспудна існуючая "партыя" Лукашэнкі. І ў лістападзе гэтага года будзе фактычна паўторана поспех на выбарах Лукашэнкі да ўсеагульнай незадаволенасці палітычных сіл, якія называюць сябе дэмакратычнай апазіцыяй.

Ларыса КЛЮЧНІКАВА.

Не хвалюйцеся, улада на месцы!

Гэта сцвярджае Мінскі гарвыканкам, аб "звяржэнні" якога жыхары сталіцы загаварылі пасля таго, як над яго будынкам раптам пачаў развявацца новы сцяг — блакітнае палотнішча з белай аблямоўкай.

Як удалося высветліць карэспандэнту БЕЛІНФАРМа, гэты сцяг паявіўся тут у адпаведнасці з рашэннем Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якая "за вялікі ўклад ва ўмацаванне міру і дружбы паміж народамі" прысудзіла шэрагу еўрапейскіх гарадоў званне "Горад — пасланец міру". Адным з іх стаў і Мінск.

Рэха расстрэлаў у 40-м

У нашай рэспубліцы з рабочым візітам знаходзіўся намеснік генеральнага пракурора Рэспублікі Польшча Стэфан Сняжко. Па выніках яго візіту ў мінулы аўторак у Нацыянальным прэс-цэнтры Рэспублікі Беларусь адбылася прэс-канферэнцыя.

Місія Стэфана Сняжко звязана з тым, што на тэрыторыі Беларусі ў 1940 годзе органамі НКУС былі расстраляны тысячы палякаў. Польскай пракуратурай яшчэ не закончана справа аб масавых расрасіях. Цяпер неабходна ўстанавіць спіс усіх загінуўшых. Суседняя з намі Украіна прадаставіла ўжо такі спіс Польшчы. У час візіту Стэфан Сняжко меў гутаркі на гэту тэму з першым намеснікам генеральнага пракурора рэспублікі Уладзімірам Кандрацьевым і старшынёй КДБ Уладзімірам Ягоравым. На прэс-канферэнцыі намеснік генеральнага пракурора Польшчы выказаў ім падзяку за садзейнічанне ў расследаванні і надзею на тое, што хутка справа гэта будзе завершана.

Аднак, паводле слоў Стэфана Сняжко, няяснасцей пакуль што хапае. Напрыклад, паводле звестак нашых археолагаў, у Курапатах пад Мінскам было расстраляна нямала і польскіх грамадзян. Акрамя таго, могуць існаваць і іншыя, невядомыя цяпер пахаванні.

Стэфан Сняжко праз журналістаў звярнуўся да ўсіх грамадзян нашай рэспублікі, каму што-небудзь вядома аб расстрэлах 1940-га, паведаміць пра гэта ў пасольства Рэспублікі Польшча.

БЕЛІНФАРМ.

Конкурс для сувязістаў

Ад Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця для фінансавання праекта міжнароднай сувязі Беларусь атрымала крэдыт, эквівалентны 30,4 мільёна еўрапейскіх валютных адзінак (экю).

Праект міжнароднай сувязі прадугледжвае паляпшэнне якасці і даступнасць паслуг электрасувязі за кошт будаўніцтва міжнародных і міжгародніх валаконна-оптычных ліній сувязі, якія маюць агульную працягласць каля 1300 кіламетраў і выкарыстоўваюць абсталяванне сінхронных сістэм перадачы.

Пастаўку, мантаж, выпрабаванне, увод у эксплуатацыю, адаптацыю з існуючай сеткай, навучанне персаналу тэхнічнаму абслугоўванню — усё гэта таксама ўключае праект. Для рэалізацыі яго быў аб'яўлены своеасаблівы конкурс на пастаўку абсталявання і паслуг, які выклікаў шырокую цікавасць вядучых сусветных фірм па вытворчасці неабходнага абсталявання і кабельнай прадукцыі. Удзел у конкурсе прынялі 45 замежных кампаній, у тым ліку і такія сусветна вядомыя, як "Эрыксан" са Швецыі, "Макроні" з Італіі, "Алкатэль" з Францыі.

Рабочая камісія Міністэрства сувязі і інфарматыкі рэспублікі пачала ацэнку пададзеных прапаноў і заключэнне кантрактаў па выкананню намечанай праграмы.

Святлана КУЛІКОВА.

Літва візы адмяняе...

Па каналах Літоўскага тэлеграфнага агенцтва (ЭльТА) з Вільнюса паступіла паведамленне, што ўрад Літоўскай Рэспублікі прыняў рашэнне часова, да 1 студзеня 1995 года, прыпыніваць запрашэнне для грамадзян краін СНД прыбыць у Літоўскую Рэспубліку да візы Літоўскай Рэспублікі.

Як растлумачылі карэспандэнту БЕЛІНФАРМа ў пасольстве Літоўскай Рэспублікі, гэта азначае, што грамадзянін СНД, які мае неабходныя дакументы для выезду за мяжу, атрымаўшы запрашэнне з Літвы, ужо не абавязаны звяртацца ў Літоўскае пасольства для афармлення візы.

БЕЛІНФАРМ.

... а Беларусь наадварот

"Прыязджайце ў зону, пагранічную..." Так жыхары Пастаўскага раёна пачынаюць лісты да сваіх родных. І абавязкова дадаюць: прыязджайце пасля таго, як вышлем адпаведную даведку-запрашэнне.

З пачатку верасня тут і сапраўды пагранічная зона. Вяскоўцы маюць у пашпартах адпаведную адзнаку. А таго, хто не мае, пэўныя службы могуць затрымаць аж да 10 сутак да высвятлення абставін. А "чужака", які заехаў у населены пункт паблізу граніцы, каб, напрыклад, праведаць родных ці пакланіцца магіле бацькі, могуць аштрафаваць на 5—20 мінімальных зарплат.

Плаці, студэнт, – дыплом атрымаеш

Ні для каго не сакрэт, што сёння кожны выжывае, як можа. Не з'яўляецца выключэннем і Беларускі аграрна-тэхнічны універсітэт.

Студэнтам усё часцей даводзіцца заглядваць у свой кашалёк. Так, завочнікі факультэта электрафікацыі сельскай гаспадаркі, не паспеўшы пераступіць парог "альма-матэр", былі "прыемна" здзіўлены, калі даведаліся, што за пропуск заняткаў ім давядзецца заплаціць 0,4 працэнта мінімальнай зарплаты, аднаго дня вучэбнай практыкі — 0,4. Перасдача экзамену ці заліку каштуе 0,15 працэнта. Тым, хто незнарок згубіць залікоўку ці студэнцкі білет, таксама давядзецца раскашэліцца. Дый само атрыманне студэнцкіх дакументаў таксама не бясплатнае. Ну, а тым, каго адлічаць за непаспяховасць, і наогул будзе туга. Каб зноў трапіць у шэрагі студэнтаў, трэба выкласці з уласнай кішэні 12 мінімальных зарплат.

Напэўна, вышэйзгаданыя меры прымусяць юнакоў і дзяўчат больш адказна аднесціся да вучобы, і нават дапамогуць стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Аднак не дае спакою думка, што ў многіх маладых вяскоўцаў грошай "кот наплакаў", бо крайне нерэгулярна выдаюць зарплату ў калгасах і саўгасах. Няўжо давядзецца ім выбіраць паміж тлусцейшым кавалкам і адукацыяй?

Вера ШЧЭЦІНА.

Курсы валют на 16 верасня:

	Даляр ЗША		Ням. марка	
	Скупка	Продаж	Скупка	Продаж
"Комплекс"	3360	3460	2184	2237
"Прыор"	3380	3420	2180	2220
"Белбізнес банк"	3200	3350	2100	2200

РЭПАРТАЖ У НУМАР

Ці хутка беларуская прэса стане еўрапейскай?

□ Павел СІМАНАЎ, "ЧЗ"

Адказ на гэтае пытанне на працягу двух дзён шукалі ўдзельнікі Еўрасемінара "Абавязкі, правы і сацыяльная абарона журналістаў", які адбыўся ў сталічным Міжнародным адукацыйным цэнтры.

У госці да сваіх беларускіх калег прыехалі прадстаўнікі буйнейшых еўрапейскіх сродкаў масавай інфармацыі. Асноўная дыскусія разгарнулася вакол праблемы свабоды прэсы — палітычнай, фінансавай, творчай. Вось толькі некалькі меркаванняў:

Доктар Георг Пауль Хэфці ("Франкфуртэр Альгемайне Цайтунг", Франкфурт):

— Свабода прэсы не залежыць ад фінансавых магчымасцей і тыражу друкаванага органа. Гэта, перш за ўсё, магчымасць кожнага без якіх-небудзь папярэдніх умоў атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю. У Германіі з паняцця "свабода прэсы" вынікаюць і пэўныя абавязкі дзяржавы. Напрыклад, канстытуцыйны суд сочыць за тым, каб не было манаполіі на сродкі масавай інфармацыі, дзяржаве не дазваляецца ўмешвацца ў дзейнасць прыватных газет ці вяшчальных станцый. Аднак дзяржаўных субсідый прэсе ў Германіі не існуе.

Спадар Бота Кірш ("Нямецкая хваля", Кёльн):

— Журналістыка — небяспечная прафесія, прычым не толькі ва ўмовах дыктатуры, але і ў дэмакратычных краінах. Вось і я быў тройчы пад судом. У двух выпадках мяне апраўдалі, а ў трэці раз мне давялося заплаціць штраф. У дэмакратычных дзяржавах свабода друку — вышэйшая каштоўнасць, якая ахоўваецца канстытуцыяй і органамі юстыцыі. Журналісты карыстаюцца пэўнымі прывілеямі. У Германіі, напрыклад, лягчэй дабіцца адстаўкі міністра, чым звольніць з працы журналіста. Зразумела, свабода прэсы не застрахоўвае і ад злоўжыванняў. Яны заўсёды былі, і, пэўна, будуць.

Спадар Тоні Робінсан ("Файнэншл Таймс", Лондан):

— Асновы асабістай свабоды і палітычнай дэмакратыі — абарона правоў уласнасці. Сацыялізм пачаўся крадзяжом уласнасці, а скончыўся крадзяжом волі.

Наша газета з'яўляецца "вачыма і вушамі" фінансавага свету, г.зн. сочыць за тым, каб захоўваліся правы ўласнасці. Роберт Максвел выкінуўся з борта сваёй яхты, таму што ведаў, што "Файнэншл Таймс" збіраецца надрукаваць выкрывальныя матэрыялы супраць яго. **Спадар Франка Квінта (Італьянская інфармацыйнае агенцтва):**

— У Італіі няма факультэтаў журналістыкі, кожны можа стаць журналістам, гэта значыць тут у нас больш свабоды. Патрэбна папрацаваць 18 месяцаў у якім-небудзь выданні, пасля чаго здаць кваліфікацыйныя экзамены. Звычайна пад час гэтых экзаменаў адсейваецца 65—70 працэнтаў. Аднак ёсць і іншая катэгорыя журналістаў — публіцысты, якія атрымліваюць прафесійную адукацыю.

* * *

Прадстаўнікі беларускіх выданняў, у асноўным, выказваліся па фінансавых і палітычных праблемах. Удзельнікаў семінара вітаў **Надзвычайны і Паўнамоцны пасол ФРГ спадар Г.Альбрэхт.** Закранаючы тэму дыскусіі, спадар пасол, у прыватнасці, зазначыў:

— Журналісты павінны заўсёды глядзець наперад. Калі яны пачынаюць глядзець назад, то становяцца ўжо не журналістамі, а гісторыкамі, прычым, як правіла, дрэннымі гісторыкамі. Спадар Альбрэхт адзначыў таксама, што гэта ўжо другі семінар журналістаў, які праводзіцца з дапамогай нямецкага боку, прычым цяперашняя імпрэза — значна больш прафесійная і дзелавая.

Еўрапейскі ўзровень семінара засведчылі і многія іншыя яго ўдзельнікі. Застаецца толькі спадзявацца, што журналісты нашай краіны — геаграфічнага цэнтра Еўропы "возьмуць на ўзбраенне" еўрапейскія традыцыі і ў штодзённай працы.

Навіны спорту

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА. Чэмпіён Еўропы Уладзімір Дуброўчык з Гродна зноў даказаў, што гэты тытул ён носіць дастойна. На камандным розыгрышы Кубка Свету па лёгкай атлетыцы наш спартсмен кінуў дыск на 64,54 м. І хаця гэта на 24 см менш за яго еўрапейскае дасягненне, тым не менш дыскабол выйшаў пераможцам. А ўдзельнічаў ён у спаборніцтвах за зборную Еўропы, у складзе якой таксама знаходзіліся нашы Эліна Зверава і Наталля Духнова. Першая з іх кінула дыск на 63,86 м, што прынесла ёй другое месца, а Наталля была трэцяй у бегу на 800 метраў.

Сярод жанчын Кубак Свету заваявалі зборныя Еўропы, у мужчын – атлеты Афрыкі.

ФУТБОЛ. Цяперашняя восень багатая не толькі на грыбы, але і на футбол. Па-рознаму складваецца лёс каманд, якія ўдзельнічаюць у еўрапейскіх турнірах, таму і расце да яго цікавасць. Не паспелі бацькі "разрадзіцца" пасля матча паміж мінскімі дынамаўцамі і рымскім "Лаціо", як пачаўся адборачны турнір чэмпіёна Еўропы сярод юнакоў. Беларускія футбалісты (узрост да 18 гадоў) у гасцях сустракаліся з равеснікамі з Малдовы і прайгралі ім з лікам 3:4. Зараз для таго, каб працягнуць турнір, нашым юным футбалістам неабходна выйграць у зборнай Балгарыі. Страчаць ужо няма чаго...

ХАКЕЙ. У чэмпіянаце Міжнацыянальнай хакейнай лігі, дзе гуляе мінская каманда "Цівалі", вызначыліся два лідэры. Па чатыры ачкі маюць маскоўскія "Крылы Савецкага" і ніжнегародскае "Тарпеда". Нагадаем, што ў заходняй зоне гуляюць 14 каманд, столькі ж – ва ўсходняй. Па восем з кожнай выйдуць у другі круг спаборніцтваў, дзе будуць змагацца за прызавыя месцы. Дарэчы, прызавы фонд цяперашняга чэмпіянату складае 200 тысяч даляраў. Пакуль, канешне, цяжка сказаць, хто прэтэндуе на гэтыя "баксы", але мінчанам, калі і далей так пойдзе, іх не відаць. Пасля дзвюх сустрэч яны маюць адно ачко і, як прызнаўся старшы трэнер Андрэй Сідарэнка, у каманды больш праблем, чым гульнявога вопыту.

Чарговы матч нашы хакеісты правядуць з маскоўскім "Дынамо".

БЕЛІНФАРМ.

"TV-5"

ДЗЕВЯТАЕ НЕБА

Дзяжурныя па выпуску перакладчык Людміла КАХАВЕЦ, рэдактар Наталля ВАЛАКІДА.

"Суперчэннэл"

У ПАРУШАЛЬНІКАХ... ПАЛІЦЭЙСКІЯ

27 паліцэйскіх у Гамбургу былі арыштаваны і звольнены за парушэнні на службе.

Паліцэйскія ў апошні час пачалі вельмі часта прымяняць сілу супраць насельніцтва. Так, напрыклад, паліцэйскі Зампалі мае ўжо 130 парушэнняў.

ДЛЯ БАЛГАРЫІ – "ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО"

Балгарыя спадзяецца на падтрымку Партугаліі.

Прэзідэнты Партугаліі і Балгарыі падпісалі дагавор аб увядзенні віз у Балгарыі для свабоднага ўезду ў краіны Еўрапейскага саюза. Для балгараў — гэта вялікі поспех. Венгрыя, Чэхія і Славакія яшчэ без віз. На перагаворах разглядалася таксама магчымасць уваходу Балгарыі ў Еўрапейскі саюз.

ПАЛЯВАННЕ НА НАРКАМАНАЎ

Буйныя акцыі супраць арганізаванай злачынасці і наркаманіі прайшлі ў Італіі і ЗША.

Паліцыя Італіі арыштавала больш за 100 прадаўцоў наркотыкамі і канфіскавала звыш 200 кг наркотыкаў. Такія аперацыі паспяхова прайшлі і ў ЗША ў раёнах горада Нью-Йорка.

ЛЮТУЕ ХАЛЕРА

Эпідэмія халеры ўспыхнула ў Албаніі.

Ужо зарэгістравана 14 смяротных выпадкаў.

"Уорлднэт"

Італія занепакоена, што эпідэмія можа ўзнікнуць і ў яе межах, бо больш за 1000 албанцаў нелегальна вандруюць па краіне. Паліцыя Італіі ўзмацніла кантроль берагавой аховы, каб пазбегнуць пранікнення хворых.

Выпадкі захворвання халерай вызначаны і ў рэспубліках былога Савецкага Саюза, але, на думку ўрачоў, яны пакуль не ўяўляюць сур'ёзнай пагрозы.

ГАІЦІ ПАГРАЖАЕ ЗША?

Сімвал амерыканскай ваеннай магутнасці — ваенны карабель — накіраваўся ў Гаіці.

На борце карабля знаходзіліся ваенныя самалёты і артылерыя. У чацвер Б.Клінтан выступіў па тэлебачанні, каб настроіць насельніцтва супраць ваеннай улады, якая была на востраве. Нестабільнасць на Гаіці азначае таксама палітычную і эканамічную пагрозу для ЗША.

"Еўраньюс"

БЛАКАДА ПАД КАНТРОЛЕМ

Праз тыдзень павінна пачацца міжнародная блакада тэрыторый былой Югаславіі і Заходняй Босніі.

Гэта пацвердзіў кіраўнік акцыі, шведскі генерал Б.Пельша. Каля 135 назіральнікаў-кантралёраў будуць удзельнічаць у гэтай місіі. Іх галоўнай задачай з'яўляецца кантроль за транспартным рухам на граніцах Югаславіі, а таксама праверка сапраўднасці правядзення блакады.

ВЫБУХ З ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ

У Заходнім Берліне на Франкфурцкай алеі адбыўся выбух бомбы.

Пасля расследаванняў паліцыі вызначылася, што бомба засталася яшчэ з Другой сусветнай вайны. У выніку выбуху загінулі 2 чалавекі, многія атрымалі раненні, разбурана некалькі будынкаў. Цяпер для паліцыі першачарговай задачай з'яўляецца размініраванне астатніх бомб.

ПАДТРЫМКА ПОЛЬШЧЫ

Францыя і Германія выказалі жаданне і ў далейшым падтрымліваць Польшчу на шляху ў Еўрапейскі саюз і НАТО.

Гэта заявілі міністры замежных спраў Жупэ і Кінкель на сустрэчы ў Гамбургу з іх польскім калегам Уліхоўскім. Яны намецілі планы для далейшага супрацоўніцтва.

(Працяг на 3-й стар.).

ДЗЕВЯТАЕ НЕБА

ПАВЕДАМЛЕННІ, АТРЫМАНЫЯ ПА КАНАЛАХ СПАДАРОЖНІКАВАЙ СУВЯЗІ "ЧЫРВОНАЙ ЗМЕНЫ"

БІЗНЕС КЛАС

БЕСПРАЦОЎЕ ЗАХОЎВАЕЦЦА

Паводле паведамлення Літоўскай біржы працы, на 1 верасня ўзровень беспрацоўя ў рэспубліцы склаў 2,8 працэнта. У гарадах не працавалі 2,1 працэнта эканамічна актыўных жыхароў, у раёнах — 3,8 працэнта.

Грамадзян, якія шукаюць работу, на 1 верасня было зарэгістравана 59.471 або на 1.279 чалавек больш, чым месяц таму. Непрацуючых жанчын зарэгістравана больш, чым мужчын — 54,6 працэнта, рабочых — больш, чым служачых — 74,1 працэнта. У параўнанні са жніўнем павялічылася колькасць беспрацоўных. Іх было зарэгістравана 26.901, што на 806 чалавек больш, чым у мінулым месяцы. Асабліва шмат непрацуючых у Таўрагскім, Скуадаскім, Гіальскім раёнах і Друскінінкаі. Сярод гарадоў першынствуюць Панявежыс і Алітус.

ЭЛЬТА-БЕЛІНФАРМ

КАМПЕНСАЦЫЯ ЗА ЧАКАННЕ

Ізраільскі банк "Мізрахі" стаў вельмі папулярным у краіне дзякуючы аднаму новаўвядзенню. Кожны кліент банка, які праводзіць у чарзе на прыём да банкаўскага чыноўніка больш за дзесяць мінут, тут жа атрымлівае ўзнагароду—10 шэкеляў. А ўстанавіць, колькі чакаў у чарзе той ці іншы кліент, дапамагае спецыяльны электронны гадзіннік з лічыльнікам.

На думку дырэкцыі банка, гэта мера даможа палепшыць умовы абслугоўвання кліентаў і павысіць узровень работы супрацоўнікаў банка.

БЕЛІНФАРМ.

АСЕННІ КІРМАШОВЫ СЕЗОН

Адразу трыма выстаўкамі — "Беларускія кантакты", "Будаўніцтва-94" і міжнародны салон "Сучасны офіс і банк" — адкрылі асенні кірмашовы сезон лідэры выставачнага бізнесу па колькасці экспазіцый у Беларусі — кампанія "Экспасервіс" і фірма "Экаінфармсістэма", Экспазіцыі, якія разгортваліся адразу на чатырох пляцоўках сталіцы — двух паверхах былой ВДНГ і ў памяшканні Белпраекта, — былі своеасаблівым фестывалем кірмашовага руху.

У лік арганізатараў міжнароднага салона "Сучасны офіс і банк", акрамя буйнейшай у рэспубліцы выставачнай кампаніі "Экспасервіс", увайшлі Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, Беларуская дзелавая газета "Біржы і банкі", а таксама шэраг недзяржаўных структур. Удзельнікамі салона сталі больш за восемдзесят фірм з Беларусі, Расіі, Італіі, Германіі. Усяго больш як 15 раздзелаў, у рамках якіх прадстаўлены офісная мэбля, вылічальная і аргтэхніка, сучасныя банкаўскія і інфармацыйныя тэхналогіі, сістэмы тэлекамунікацый, сістэмы аховы і кантролю. Акрамя таго, у час выстаўкі адбыўся шэраг цікавых і актуальных семінараў. Частку з іх правялі работнікі Нацыянальнага банка Беларусі.

У іншых экспазіцыях — "Беларускія кантакты" і "Будаўніцтва-94" — прынялі ўдзел каля ста прадпрыемстваў з краін Балтыі, Польшчы, Індыі, Кітая, Славакіі, Германіі, а таксама Беларусі і Расіі. Тут на стэндах дэманстраваліся будаўнічыя матэрыялы, апалубка для маналітнага будаўніцтва, розная тэхніка, сантэхнічнае абсталяванне, тавары шырокага ўжытку. Асаблівае месца ў экспазіцыі займаў раздзел энергазберагаючага абсталявання, цеплавых і электрычных лічыльнікаў, рэгулятараў тэмпературы.

Святлана КУЛІКОВА.

СКРЫЖАВАННЕ

Познесавецкі рэквіем

У шэрагу ўдзельнікаў нядаўніх прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі былі прадстаўнікі розных палітычных плыняў. У сродках масавай інфармацыі менавіта такім чынам і праводзілася класіфікацыя прэтэндэнтаў — па палітычных прыхільнасцях, прыналежнасці да таго ці іншага палітычнага лагера. Тройчы ўжыўшы слоўца–прыметнік "палітычны", скажам пра іншае: падобная класіфікацыя адносна ўмоўная, таму што вобразы, ахутаныя ідэалагізаванымі рознаколернымі штандарамі, цалкам не падпарадкоўваюцца дастаткова прамалінейнаму размеркаванню па нішах агульнавядомай і зноў жа ўмоўнай канструкцыі.

Палітыка палітыкай, але ёсць і іншыя адметы. Пасля таго, як засталася на актыўных ролях магічная сямёрка, а потым і шасцёрка кандыдатаў, можна было рабіць паўныя высновы. Толькі два сімвалізавалі дэмакратычную ідэю ў чыстым выглядзе. Прычым, што галоўнае, сімвалізавалі яе як прадстаўнікі навукова-творчай інтэлігенцыі. Былі (сярод стаўшых да таго часу статыстамі на палітычнай авансцэне) другарадныя фігуры, аднак засталіся дзве. Тады ўжо не з'яўлялася ніякім сакрэтам, што ў народнай свядомасці зборны вобраз дэмакратыі (у тым ліку і беларускай) патроху цьмянее.

Па ўсёй верагоднасці, параўнанне на выбарах прадстаўнікоў каменклатурна-элітарнай інтэлігенцыі было, што называецца, запраграміравана. Вось іх адрозненне ад астатніх — прыналежнасць да інтэлектуальнай часткі грамадства. І справа не ў "белым срэбры" кашуль (існуе перакананасць: просты народ не любіць такой дэманстрацыі "саноўнасці"), дакладней, справа не толькі ў гэтым. Ёсць больш важкія прычыны і ўмовы, па якія трэба сказаць колькі слоў. Бо пройгрыш інтэлігенцыі самага рознага калібру на выбарах стаў сумнай традыцыяй. Дастаткова прыгадаць адну з апошніх драматычных няўдач інтэлігентаў-дэмакратаў — маскоўскае параўнанне гайдараўскага блока "Выбар Расіі". Што асабліва адметна, прайгралі не каму-небудзь, а ліберал-дэмакратам, жырыноўцам. Чаму ж адбываюцца ўвогуле цяжка тлумачальныя рэчы, няўжо сапраўды прыкметы здзічэння паспрылялі падобным метамарфозам у грамадстве? Здаецца, яшчэ ўчора ўсё было інакш. Інтэлігенцыя (сінонім дэмакратыі) займала ў ім сваё пачэснае месца. Метамарфозы адбыліся, і адбыліся яны ў рэчаіснасці.

Павароты ў гісторыі заўсёды небяспечныя. Глабальныя скорасныя павароты непрадказальныя. Катастрафічны крэн дзяржавы-казкі, пачаўшыся на ўзроўні камедыянцкім (а ўспрымаўся ён менавіта так мільёнамі), раптоўна набыў рэальныя абрысы, цяжкаважкія асновы затрасліся пагражальна, многія людзі (асабліва на памежнай перыферыі) убачылі апакаліптычныя карціны наяве. Такое бывае ў чорных снах, але пры гэтым у падсвядомасці мільгаціць надзея на абуджэнне. Ад якіх калектыўных сноў абудзіліся мы і ці абудзімся ўвогуле, калі Баян маўчыць, і мелодыка заходніх рок-фарсажаў халодзіць параненае народнае сэрца?

Маўчанне былых заштатных савецкіх залатавустаў узнікла не на пустым месцы. Ім заўсёды не было чаго сказаць. Яны тварылі ў міфалагізаваній прасторы, ствараючы новыя і новыя ілюзорныя блокі пустаты, называючы гэта мастацтвам сацрэалізму. Па-за рамкамі псеўдакультуры заставаліся і жыццё, і смерць. Калі надышоў час, яны без вагання акунулі свае свісцячыя пёры ў ваду забыцця і хорам пачалі сачыняць грандыёзна-лжывую казку, паколькі прыстасаваліся да пісьменніцтва па заказу.

Пісаць можна толькі крывёю, сцвярджаў забаронены камуністамі Ніцшэ. Забыўшыся пра тое, армія інтэлектуалаў гарбачоўскага закліку стварыла яшчэ адзін міф, такі ж снатворчы, як і папярэднія. Народ яшчэ раз паверыў сваёй інтэлігенцыі, таму што лексіка казкі пра новае мысленне запазычвалася з іншага жыцця. Хаця завалы заходняй цывілізацыі і культуры былі не вядомыя камуністычным казачнікам, прынамсі, імі не зразумелыя. Цяпер адны замоўклі, другія, абжываючы свае творчыя харомы, адышлі ад тэмы, трэція, махнуўшы на развітанне белай рукой, перамясціліся ў тыя краі, якія апявалі. Народ застаўся стаяць у атарапеласці, не ведаючы, каго слухаць зараз. Упаўне зразумелая крыўда: інтэлігенцыя абышлася з ім, як Баба-Яга з Іванкам. Напярэдзе непралазная чашчоба рэформы, за ёй — цаліна, задворкі цывілізацыі. І адбылося ўсё не проста так, таму што трагедыя развіваецца па сваіх законах.

Жывою вадой парабудовы была магутная ідэйна-мастацкая хваля дысідэнцтва, падмыўшая ў свой час падмуркі не аднаго чырвонацаглянага будынка антынароднага рэжыму. Высокія таленты, народжаныя ў эпоху мятазгоднай партыйнай структуравання, бязлітасна выбіваліся з яе ніш. Іх звяргалі рукамі літсабратаў-разбойнікаў, рассявалі па свеце. Але народ хварэе за пакрыўджаных і абяздоленых. Гэтыя высокія імёны і выкарысталі ў належны момант тыя, хто здраджваў і выганяў. Гэтымі высокімі імёнамі і прыкрыліся містыфікатары. Перабудоўчная сучаснасць багатая на прыклады падманнага, падтасаванага ўзвялічвання.

Чорны налёт здрады — на душах пішучай браці: ілжэпісьменнікаў, малодшых навуковых супрацоўнікаў, эканамістаў-аднадзёнак, журналістаў. Людзі, якія мелі доступ да друкарнага станка або атрымалі яго пры галоснасці, стварылі ілюзію рыначнага дабрабыту, перакруціўшы чужыя ідэі. Увесь пафас дысідэнцкай літаратуры, філасофіі, культуралогіі якраз быў накіраваны на абарону інтарэсаў асобы, маральнасці і вечных духоўных устояў, але не той цаной, якую прапанавалі калярыначныя невукі.

У сапраўдным рынку сацраалісты не праіснавалі б і дня. Таму што бізнес — гэта вайна ідэй і розумаў, бітва гігантаў. У рыначнай прасторы нашы карлікі-графаманы нікому не патрэбныя, хіба што вузкаму колу такіх жа малаадукаваных "таварышаў па пяру". Перабудова стала іх зорнай гадзінай. Прысвоіўшы сабе славу сваіх ахвяр, яны праславіліся самі. Нават на Захадзе, які з абыякавасцю язычніцкага ідала назіраў за іх мітуслівым шавяленнем. Толькі пісьменніцкая дыяспара, як ніхто разумеўшая сэнс трагічнага падману, узвысіла голас у абарону простага народа. Але гэта быў марны голас у пустыні.

Выканаўшы нескладаную задачу, прапагандысты ад культуры засяродзіліся на ўласных праблемах. Яны па-ранейшаму, насуперак логіцы абставін, без стомы пішуць і нават хаатычна выдаюцца...

На зыходзе "сярэбранага веку" ў геніяльных паэтаў-прадракальнікаў самым распаўсюджаным быў вобраз палаючых будоў. Апошнія трагічныя акорды вялікай літаратуры сімвалічна афарбоўваліся ў вогненна-чорныя таны ("Палымяны круг", "Палаючыя будынкі", "Попел" і іншыя славутыя зборнікі). Прароцтвы збыліся, але факельнае шэсце нашых дзён азарае людзей не агнём самаспалення ў імя Ісіны і любві, а нейкім сатанінскім полымем.

Магчыма, адбылося наступнае. Ці адбываецца. Доўгія гады ў народзе жыў вобраз пакутніцкай творчай інтэлігенцыі. Міф пра руховую ахвяру дэспатычнага рэжыму разбурыўся (?) пасля таго, як інтэлігенцкія вярхі палітатўску памылі рукі перад чарговым каставым банкетам. Мабыць, вобраз ахвяры пасяліўся ў народнай душы, і новы рэквіем аб ягоных блуканнях-пакутах складуць іншыя пакаленні.

Вядома, у Беларусі такая ўяўная (але агульная) тэндэнцыя развівалася больш павольна. Не Расія — не той размах. Але нават калі толькі водбліск маскоўскага пажару дасягнуў беларускага ржэўніку — і дастаткова. Выбары былі прайграны айчыннымі інтэлектуаламі (з якімі атаясамліваліся стэрэатыпныя вобразы) яшчэ да пачатку афіцыйных змаганняў. Хаця і ў нас элітарная інтэлігенцыя, безумоўна, мела гістарычны шанц, каб паламаць постсавецкі стэрэатып народнага аднабаковага ўспрымання свайго аблічча. Пакуль яе місіянерскі напал — у "холадзе ночы". Горка-самотны ўрок на будучыню. І ўсё ж не трэба забывацца: мы б загінулі, калі б не гінулі. Таму ні сама ідэя дэмакратыі, ні яе носьбіты не могуць пайсці ў цень. Іх мэта ранейшая — новае адраджэнне. І гэтак — бясконца.

Якаў ЯСЭПКІН.

ЗВАНОК НА ЎРОК

Былое і думы

На гары на крутой, на абвітай ракой,
Лет назад таму сотня ці болей,
Белы хорам стаяў...

Ці не пра Бачэйкава гэтыя купалаўскія радкі? Правабярэжжа ракі Улы, што дзеліць вёску напалам, тут сапраўды гарыстае. А хорам? Чытайма ў энцыклапедыі "Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі":

"ПАРК (архіт.). За 500 м на паўднёвы ўсход ад вёскі, на правым беразе р.Ула. Закладзены пасля 1769 г. Парк рэгулярнага тыпу. Размешчаны на прыпойменным верхнім плато і пакатым схіле, апрацаваным 3 паралельнымі тэрасамі, якія спускаюцца да ракі.

Цэнтрам сіметрычна-восевай кампазіцыі парку быў мураваны аднапавярховы палац (закладзены ў 1769 г., не збярогся). Перад ім размяшчаўся авальны партэр, да якога вялі 2 узаемна перпендыкулярныя алеі... Перад палацам масіў ліп і таполяў, пасаджаных па рамбічнай планіровачнай сетцы. Частка парку за палацам аформлена газонамі, шпалерамі, баскетамі, фантанам, лабірынтам. Складаная кампазіцыя дарожак утварала манаграму Ініцыялаў уладальніка маёнтка і геральдычныя фігуры фамільнага герба. Тут раслі ліпы, без персідскі, гартэнзія мяцёлчатая, кедры, паўночнаамерыканскія елкі. Некалькі штучных вадаёмаў, размешчаных у вуглавых частках парку, маюць правільную форму (квадрат, прамавугольнік, авал). З заходняга боку да парку прымыкаў сад...".

Верасень. Нягледзячы на неўраджайны год, у Бачэйкаве спеюць яблыкі. Сёлета зямля тут імі, як усыпана. Чырванашчокія, крамяныя — так і просяцца ў рот. Ды на яблыкі тут, бадай, ніхто не зважае. Наеліся. Вунь ля самай школы, на асфальтаваній дарожцы, валяюцца грушы, праўда, кіславатыя ды сопкія, але есці можна. Таксама нікога яны не цікавяць. Дзякуй Богу, восень вёску накармілі. Вось бы крыху яе дарункаў ды ў нашы напаўгалодныя гарады, дзе, бядуюць мае знаёмыя, нават боршч для простага працоўнага чалавека становіцца ледзьве не раскошаю. Дарагоўля і нішчымніца, Ізноўку багатыя і бедныя. Казаў той Францішак Багушэвіч:

Адзін ходзе ў саеце,
У золаце а плеч да ног,
А другому, каб прыкрыцца
Хоць анучай, — велькі труд;
Увесь, як рэшата, свіціцца,
Адны латы, адзін бруд!

Людзі даношваюць апошнія транты, купленыя яшчэ за "сацыялізмам". Вось табе і хвалёная капіталізацыя.

Дзе раней быў парк Ціханавецкага, зараз растуць яблыні. Праўда, ад парку засталася хіба назова. Ёсць яшчэ паасобныя векавыя дрэвы, ёсць нават алеі. Захаваліся рэшткі копанак. Але не засталося ні нават следу ад панскага палаца. Зараз тут раскашуе архітэктура дваццатага стагоддзя: ПМК, новая бальніца і школа. Праўда, яшчэ стаяць шкілеты і нейкіх старых будынкаў. Хто ведае, мо яны яшчэ і з дарэвалюцыйных часін. Ды няма, відаць, тае гаспадарлівай рукі, якая была ў паноў Ціханавецкіх, — няма будынкам прыспасобу. Аслеплі павыбіваныя вокны, аглухлі напаўразабраныя, відаць, на цэглу, сцены.

Распавядаюць, нібыта не так даўно сюды з Англіі прыязджаў нашчадак панскай фамініі, які, дарэчы, зараз займаецца мецэнацтвам. Паглядзеў ён на разбураны, знішчаны парк, паківаў галавою ды так і пехаў, ні капейкі не ахвяраваўшы ні калгасу, ні школе. Пакрыўдзіўся, відаць, паніч за тое, што самі свайго не беражом. А мясціна, я вам скажу, прыгожая, райская тут мясціна.

— Паны ведалі, дзе сяліцца, — нібы прачытаўшы мае думкі, казала бабулька, якую сустрэў у парку.

— Тут, відаць, ёсць і іншыя, невядомыя дрэвы?

— Ды не, ліпы, клёны. У вайну немцы багата дрэў павысякалі.

Яно, можа, у Бачэйкаве і не вінаваты, што не здолелі захаваць для нашчадкаў такую багатую спадчыну. Як-ніяк, былі войны, людзі галадалі, мерзлі. Ці да помнікаў было! Дый свае вунь з вайны паявіліся помнікі: магіла маёра Чырвонай Арміі Вераб'я, што загінуў тут у баі, абеліск памяці землякоў з калгаса "Бачэйкава", якія таксама ахвяравалі сваімі жыццямі пад час апошняй вайны. А ўсё роўна крыўдна. Што ж у нас за зямля такая заклятая, што спадчыны бацькоў не можам зберагчы?! Выракаемся, цураемся мовы сваёй і ўсур'ёз лічым такое становішча нармальным, а моўнае пытанне — надуманым. Сячом векавыя дрэвы, каб... у печы выпаліць — фактычна сячом сук, на якім сядзім. Дакуль жа нас, беларусаў, будзе караць Бог, трымаючы ў палоне ганебнай псіхалогіі галоднага страўніка?! Ці не перасядзе нам калі ў горле манкурцкая кілбаса гостраю косткаю?! Ці не адрынецца горкім палыном нашае бяспамяцтва?!

У Бачэйкаве, дарэчы, паводле слоў дырэктара школы Вольгі Аляксандраўны Царэшчанка, родную мову і ведаюць, і любяць. У школе практычна ўсе прадметы выкладаюцца па-беларуску, нават замежная мова, выключэнне складае пакуль хіба інфарматыка. Тут ніколі не паўставала пытанне, навошта нам гэтая, "мужыцкая, лапцюжная" і г.д. Што ні кажы, а кансерватыўную беларускую вёску далёка абагналі гарады па тэмпах манкуртызацыі.

Кагадзе ў школе закончыўся тыдзень беларускага пісьменства і друку, які праходзіў тут пад дэвізам "Пісьменства і друк Беларусі — крыніца культуры і духоўнасці народа". Сапраўды, педагогі ў Бачэйкаве яшчэ доўга могуць пазычаць і духоўнасць, і культуру ў дзядоў-прадзедаў. Невычарпная крыніца мінуўшчыны. Паэт казаў:

Збіраць пачнем зярно к зярняці,
Былое ў думках ускрашаць,
Каб свет на новы лад пачаці
І новую сяўбу пачаць.

І ў Бачэйкаве збіраюць, старанна, беражліва, па каліву. Тут ствараецца школьны музей, дзе захоўваюцца здымкі і таго слаўтага парку, і матэрыялы больш позняй гісторыі вёскі, звязанай з гадамі Вялікай Айчыннай вайны. Тут прапісаліся таксама сялянскі ткацкі станок, ступа, драўляны ложак, прасы, качалкі і шмат якая іншая драбяза. Але ж драбязою яе грэх называць, бо кожны прадмет мае свой твар, бо за ім — цэлае пражытае жыццё. Скажам, вось ляжыць ільняная кудзеля, якой, мабыць, сто ці болей гадоў.

Школьны музей пакуль размяшчаецца ў невялічкім пакойчыку. А добра было б увогуле зрабіць у Бачэйкаве свой вясковы музей, балазе тут шмат пустае памяшканняў старой архітэктуры. А экспанаваць тут знойдзецца што.

Мабыць, у школьным музеі і пачаўся тыдзень беларускага пісьменства і друку — першы школьны тыдзень. Пасля было свята "Дзень добры, школа", вечар для старшакласнікаў "Гучы, родная мова", конкурснае сачыненне "Мой родны кут, як ты мне мілы", выставы "Помнікі гісторыі і культуры Беларусі", "Спадчына роднага краю". Адным словам, свята, якое праводзілася сёлета ўпершыню, тым не менш, атрымалася насычаным падзеямі і ўражаннямі.

Забыўся сказаць, Бачэйкаўская сярэдняя школа славіцца яшчэ і сваімі ганчарамі. Тут пад кіраўніцтвам майстра Тацяны Мікалаеўны Касянец звычайная мясцовая гліна ператвараецца ў цудадзейныя вырабы, якія могуць упрыгожыць не толькі школьны музей, але і любую прастыжную выставу.

Жыве на Віцебскай шашы Бачэйкава — ні вёска, ні гарадок. Для вёскі тут багата розных гарадскога тыпу адміністрацыйных, гандлёвых, культурных устаноў, а для горада занадта не толькі яблыкаў у садах, але і чысцюткай, не кранутай яшчэ псеўдацывілізацыяй прыгажосці душы — таго здабытку, да якога нельга падыходзіць са звычайнымі кілбаснымі меркаваннямі. А можа, мясціна тут такая — запаведная?..

Уладзімір МІХНО,
Бешанковіцкі раён.

ПАТРАБУЕ ВЫРАШЭННЯ

Маленькая праблема, што стала амаль дзяржаўнай

"Штовечар Сяргейка просіць пачытаць сваю любімую казку пра сястрыцу Аленку і яе братка Іванку. Асабліва падабаецца яму месца, дзе бедную сіротку бярэ замуж купец. "Я апрану цябе ў золата-срэбра, і будзеш ты жыць са мной у цудоўным палацы", — паўтарае ён за мной. І задаволены засынае. Раніцай борздзенька ўстае. Яму падабаецца хадзіць у дзіцячы садок, бо там у яго два новыя сябрукі — таксама Сяргейкі, і любімая выхавальніца Лілія Міхайлаўна. Але як толькі пачынаю апранаць яго, бадзёры настрой адразу змяняецца слязамі. "Не патрэбны мне гэтыя калготкі, давай новыя", — тупае ён нагамі, і ніякія ўгаворы не дапамагаюць. Якая справа трохгадоваму карапузу да таго, што адзіныя новыя калготкі не высахлі, а я ўвечары старанна цыравала працёртыя. "Купі новыя", — вось і ўся размова. Мне так надакучылі гэтыя ношукі калготак, трусоў, маек, і ўсё ж паехала па магазінах зноў. Знаёмыя казалі, нібыта з'явілася штосьці ў продажы. Бліжэйшы ад маёй работы — дом гандлю "Першамайскі". У цесным закутку, выціснутыя валютнымі, — дзіцячыя тавары. Тут шмат ажурных шкарпэтак (сёння быў завоз), а калготкі толькі 12-га і 20 памераў. Але мой сынок перасягнуў ужо 80-сантыметровы рубеж, а да 140 яшчэ не дарос... У ЦУМе "Мінск" ідзе капітальны рамонт, і гандлююць на вуліцы ў кіёсках. Ды толькі не таварамі дзіцячага асартыменту. І ў ГУМе таксама нібыта карова языком злізала, 14, 16 і 18 памеры. "Дзіцячае адзенне" на праспекце Скарыны прапануе шмат што, у тым ліку для дарослых, але не тое, што мне патрэбна. Апошняя надзея — магазін "Дзіцячы свет" на вуліцы Якуба Коласа. Там у крайнім выпадку з рук можна купіць новыя дзіцячыя рэчы. Але... "Как в афишу коза" глядзіць на мяне панурае расфарбаванае дзяўчо з-за прылаўка. "Адкуль я ведаю, чаму няма патрэбнага вам памеру", — так яна разумее ветлівае абслугоўванне пакупніка. І, зразумела, ёй няўцям, што найпершы абавязак гандлюючай арганізацыі — забяспечваць нас неабходнымі таварамі, патрабнай колькасці, якасці і памераў... Пабывала я і ў іншых магазінах. І на вуліцы Першамайскай, і на праспекце Пушкіна, і ў Серабранку ездзіла. Толькі ўсё дарэмна. Няма ў горадзе калготак для трохпяцігадовых дзяцей".

"Што рабіць?" І "Калі гэта скончыцца?" — такімі пытаннямі падсумавала свой аповед Валянціна Шацілава, якая ў роспачы наведала рэдакцыю "Чырвонкі". Мы з разуменнем паставіліся да яе праблемы, тым больш, што і для мам-журналістак яна актуальная. Каб прасяніць сітуацыю, патэлефанавалі ў Міністэрства гандлю Рэспублікі Беларусь начальніку ўпраўлення арганізацыі спажывецкага рынку тавараў лёгкай прамысловасці спадару Сліжову. Міхаіл Іванавіч пракаментаваў становішча, што склалася, наступным чынам:

— Існуе міжурадавае пагадненне паміж Узбекістанам і Беларуссю наконт паставак бавоўны, але яно, на жаль, не выконваецца. А паколькі няма бавоўны — няма з чаго Баранавіцкаму і Гродзенскаму камбінатам вырабляць пражу і ніткі. Па гэтай прычыне прастоявалі многія прадпрыемствы лёгкай прамысловасці, сярод іх такія гіганты як КІМ, Брэсцкі панчошны камбінат.... Апошнім часам сітуацыя крыху палепшылася. На прылаўках з'явілася прадукцыя нашых прадпрыемстваў, многія з якіх самі імкнуцца вырашаць пытанне з сыравінай.

...Хочацца верыць, што пытанне з бавоўнай будзе вырашацца не толькі на прадпрыемствах, а і на дзяржаўным узроўні. Бо праблемы ў нашых маленькіх грамадзян, як бачым, зусім не маленькія.

Вера ШЧЭЦІНА.

Усё больш гаспадарак у Беларусі разводзяць плямістых аленяў. Тры гады таму завезлі такіх аленяў і ў калгас імя Горкага Пінскага раёна. Зараз тут разам з маладняком 230 асобін. Атрыманы і першы збор пантаў.

Фота Эдуарда Кабяка.

ЗАМАЛЁЎКІ З НАТУРЫ

Певень

Прыгарадны дызель-поезд мерна адстукваў коламі, спыняўся амаль што праз кожныя пяць хвілін — высаджваў і падбіраў людзей, а потым, злёгку паднацяўшыся, набіраў хуткасць. Пасажыраў у кожным вагоне было што селядцоў у бочцы: не кожнаму падфарціла нават зручна стаць.

Звычайны ў такім выпадку малюнак: адны кімараць, другія ўперылі вочы ў дэтэктыў або ў газету, трэція ж проста моўчкі сядзелі ці стаялі, раз-пораз кідаючы позірк на знікаючыя за акном краявіды. І раптам: "Ку-ка-рэ-ку-у-у!". Вагон грымнуў ад смеху. Певень унёс такое ажыўленне, што і пераказаць цяжка. Потым "ку-ка-рэк-ку-у" паўтарылася. Смех быў ужо не такі дружны, як хвіліну ці дзве раней, але ўсё ж быў... Быццам артыст, адказваючы на апладысменты ўдзячных гледачоў, певень працягваў пацяшаць людзей, пакуль тыя не насыціліся яго спевамі. А пазней і певень замоўк, і людзі прыціхлі. Зноў — дэтэктывы, газеты, абыякавыя позіркі за акно, на суседа. Дык вось жа цікава: ну, а каб певень загарлапаніў недзе на вясковай вуліцы? Спявай сабе, ніхто і брывом не павядзе. На гарадской жа — цікава, адкуль ён тут? У вагоне — таксама цікава. Усяму, кажуць, сваё месца. Так і з гэтым пеўнем атрымалася.

Можа б я і не стаў пісаць гэтую замалёўку, але ж дужа цікавым падаўся мне дзядок, што вёз крыкуна ў кашолцы. Вясковы дзядок. Ён падсеў недзе пасярод дарогі, і праехаў усяго-наўсяго два прыпынкі.

— Гэта асаблівы певень, — зіркаў надслепавата стары па баках. — Яму цаны няма. Такім пеўням помнікі ставіць трэба, а мая баба — ды ну яе! — забі і забі. Бач ты, што надумілася зрабіць. Не, пеця, цябе я ў крыўду не дам. Ты мяне выручаў, і я цябе не пакрыўджу. Радзіма сваіх герояў помніць. А гэта ж, браткі, перабраў я надоечы, галава развальваецца па частках, а баба дулю замест апахмелкі паказвае. Ведаю, што ёсцека. Злы на маладзіцу, вочы б мае яе на той час не бачылі. Я да яе і так, я і гэтак, а яна заўпарцілася — хоць ты што ёй рабі. Паміраю, можна сказаць, а не разумее. Дзе ж ёй, бабе, мужыка зразумець? Ну! І медалі, што на фронце зарабіў чэсным пуцём, не ў залік. Сяджу на лаўцы, бядую. А тут, бачу, певень у гародчыку корпаецца... Зацікавіўся я, назіраю. І — верыце? — паказалася вечка... Я яшчэ больш зацікавіўся. "Давай, давай, пеця, ці не той гэта скарб, які і для мяне інтарэс мае?" — падбадзёрваю. Так! Ён, трохлітровы слоік! Дзівосы! Ад радасці я і ўзняцца з лаўкі не магу — хаду адняло. Падбягаю, дапамагаю пеўню... Ён мне, як разумная істота, саступае: калі ласка, далей сам капай! А сам убаку стаіць, цікуе за мной. Выцягваю. Фу-у! Вось тут я, дзякуючы пеўню, і паправіў сваё і без таго гіблае здароўе. Так што, гэты певень — герой. А баба: забі, у чыгунок яму пара. Гэта каму? Пеўню гэтаму? А смалы ты не ела, старая. Не, нізашто. Пакуль сам жывы — і пеўня не дам у крыўду. Вось і ратую яго, бедалагу. Да дружка свайго вязу, няхай у яго жыве... падалей ад варожага вока... А жонцы скажу: дык адкуль жа ведаю, куды ён, пеця, падзеўся? Не бачыў, скажу. А Сцяпан у крыўду не дасць — разам з таго слоіка пілі. Ён мяне зразумее. Прадоўжым жыццё пеўню. А то, бач ты яе, у чыгунок... Багата чаго вы хочаце-прагнеце ад нас, бабы. Скажы, пеця?

Пеўня ж, пакуль і не выйшаў дзядок, не было чуваць: спаў. Як усё роўна і не ведаў, што няма чаго хваляваць, мужыкі вырачаць, як некалі і ён іх...

Блінцы

Адзін мой добры знаёмы жыве ў Мінску, і калі надараецца магчымасць пабываць у сталіцы, я не шукаю, дзе прытуліць галаву. Папершае, у гасцініцу і спрабаваць уладкавацца дарэмна: там колькі і помню гэтыя "дамы для ўсіх", кожнага разу вісіць шыльдачка — чорным па беламу: "Месцаў няма". Быццам ніхто не выязджае — як засяліўся чалавек, так і жыве. А па-другое, навошта тая гасцініца, калі ў цябе ёсць сапраўдны сябра — не пераяліся яны пакуль, і гэта грэе сэрца! — дзе табе заўсёды рады. Там накормяць, абагрэюць, суцешаць, калі што баліць, і спаць пакладуць на самую лепшую пасцель. Да такіх людзей, як мой сябра Мікола і ягоная жонка Лена, праўду кажучы, і цягне, абысці іх кватэру — таксама здрада. З імі — добра.

І кожны раз, калі я еду да Міколы з вакзала, чамусьці ўяўляю адну і тую ж карціну: сустрэне мяне гаспадар, як заўсёды, з усмешкай на твары, моцна пацісне мяне сваімі дужымі рукамі за плечы, перакінемся словам-другім, а потым ён выцягне з-пад стала самаробны зэдлік, сядзе на яго, падкурчыўшы ногі, — і пачне абіраць бульбу. Папаўзе з ягоных рук у вядзерца тонкая, амаль як не празрыстая, шалупейка. Лена ж пачне завіхацца побач на кухні: будзе рэзаць на скрылькі сала, агурочкі, нешта смажыць. Але не дакранецца да бульбы. Гэта ўжо дакладна. Толькі ён, Мікола.

Прызнаюся шчыра: мяне гэта ўсё здзіўляла. Хацеў не раз спытаць, чаму лупіць бульбу толькі гаспадар, але не хапала ўсё ж такту. Якая каму, у рэшце рашт, справа? Можа яны запалкі пацягнулі, хто што з іх усё жыццё будзе рабіць.

Так і не асмельваўся я запытаць. Звяжджаў — пакідаў гасцінных людзей. Але Мікола аднойчы сам пра ўсё расказаў, седзячы на тым жа зэдліку:

— Ты, відаць, думаеш, што Ленка ў мяне моцна на шыі сядзіць? Вось і бульбу абіраць прымушае. Не, браце, не. Сам. Сам. Усё куды складаней. Гарадская яна. А я з вёскі — ведаеш жа. І не магу глядзець, калі шалупейка тоўстая з-пад нажа высвіствае, калі ў адходы шмат з бульбіны трапляе. А мы ж, помніш, канешне, увесну пасля вайны мёрзлую бульбу збіралі на калгасным полі. Мама блінцы з яе пякла. Смачнейшай, відаць, ежы не было...

Васіль ТКАЧОЎ.

ІНФА-КРЫМ

ГІРА НА ГАЛАВУ

Жыхар Маладзечна Р. "вынайшаў" асабістую прыладу супраць кватэрных зладзеяў.

Калі б апошні адчыніў дзверы кватэры, яго б аглушыла двухпудовая гіра. Усё прагледзеў гаспадар кватэры, толькі пра сябе не ладумаў. Вярнуўся ён неяк "пад моцнымі градусамі дамоў" і па гэтай прычыне забыў адключыць сваё прыстасаванне ў дзвярах. І яно, безумоўна, выдатна спрацавала — аглушыла свайго "вынаходніка", якога завезлі ў 5-ую бальніцу.

Урачы кажуць, што калі б Р.быў цвярозы, гіра забіла б яго насмерць.

СМЕРЦЬ САМАГОНШЧЫЦЫ

У Маладзечна нідзе не працуючы 37–гадовы Ш. уварваўся ў кватэру самагоншчыцы і моцна збіў яе.

Яго злосць выклікала тое, што гаспадыня прадала яму гарэлку нізкай, на яго думку, якасці. У бальніцы жанчына памерла. Вось такі жорсткі "АТК"!.. Забойца затрыманы.

І ТРЫ НУЛІ Ў ГАЛАВЕ

Насцярожылася касірка магазіна–гастранома горада Маладзечна, калі пакупнік выбіў у яе чэк на 150 рублёў.

Праз некаторы час ён зноў наведаў магазін і прад'явіў чак на 150 000 рублёў. Работніца прылаўка затрымала пакупніка і выклікала міліцыю. У квітку прадпрымальны пакупнік дамаляваў праз капірку тры нулі, каб прыдбаць сабе кілаграм вэнджанай каўбасы.

А "МЕРСЕДЭС" БЫЎ ПРЫГОЖЫ

Артур П.з Маладзечна вырашыў заняцца камерцыяй на аўтамабільным бізнесе і паехаў у Германію.

Там ён меў намер займець легкавік замежнай маркі. Прыехаўшы ў баварскі горад Фільсхафен, аблюбаваў там "Мерседэс" апошняй мадэлі. Але тут яго напаткала самае сапраўднае няшчасце: з 85 тысяч даляраў ЗША, якія Артур купіў на маладзечанскім кірмашы ў заезджых каўказцаў, амаль усе аказаліся фальшывымі. Сапраўднымі былі толькі дзве грашовыя паперкі па 100 даляраў.

РАЗ У ГОД І ПАЛЕНА СТРАЛЯЕ

Вырашыў адвучыць красці дровы са свайго двара жыхар Радашковіч.

Ён паклаў у двары бярозавае палена, у якое ўманціраваў зараджаны патрон з дубальтоўкі. Неўзабаве адзін з суседзяў "пакарыстаўся" гэтым паленам. Укінутае ў печ "баявое" палена выбухнула, разнесла выбухам печ, выбіла ў вокнах шыбы. Пацярпеўшы са скаргай нікуды не звяртаўся.

САМАЗАБОЙЦУ НЕ ПАШАНЦАВАЛА

Не ажыццявіў свой страшны намер жыхар горада Маладзечна Х., які вырашыў забіць сябе. Ён выкуліўся з балкона сваёй кватэры.

І, мабыць, пайшоў бы на той свет, калі б не шчаслівая выпадковасць. Праляцеўшы некалькі паверхаў, ён трапіў на вяроўкі, нацягнутыя паміж драўлянымі распоркамі, на якіх суседзі сушылі бялізну. Гэты імправізаваны "батут" перарваў свабоднае падзенне ц

З ЖЫЦЦЯ ЗОРАК

"Джэймс Бонд – агент 007"

Кінаакцёр Роджэр Мур, які сыграў некалькі роляў Джэймса Бонда, запрошаны ў якасці спецыяльнага госця ў Лос-Анжэлес на канвенцыю пад назвай "Джэймс Бонд — агент 007".

Акрамя Роджэра Мура, які здымаўся ў ролі суперагента на працягу 12 год, запрошаны таксама і рэжысёр Браколі. Апошні, увогуле, і адкрыў вобраз Джэймса Бонда для тэлевізійнага экрана.

Ілжывая стужка

Суддзя Мондэй адхіліў абвінавачванне Элізабэт Тэйлар.

Яна змагаецца з кампаніяй Энбі-сі, якая рыхтуе зараз праграму пра жыццё актрысы. Сама Тэйлар паведамляе, што ў гэтым фільме непацверджаныя факты выдаюцца за рэальныя. На яе думку, фільм не толькі парушае яе асабістае жыццё, але таксама можа пашкодзіць яе рэкламнай дзейнасці і падарваць імідж.

Тры невядомыя песні

Кортні Лав, удава вядомага музыканта Курта Кобейна, скончыўшага самагубствам, паведаміла, што выявіла 3 невядомыя да гэтага часу песні свайго мужа.

Адна з іх будзе перададзена Ігі Попу, другая — Марку Ланегану з групы "Скрымінг Трыз".

Каму будзе перададзена 3-я песня, пакуль невядома.

Нечаканасці не было

Вядомы басіст з групы "Летонхэдз" Нік Далтан пакінуў сваю былую групу.

Зараз ён збіраецца сканцэнтравацца на майстэрстве створанай ім самім групы "Голдстар". Гэты адыход не з'явіўся для ўсіх астатніх музыкантаў нечаканасцю, паколькі Далтан з самага пачатку заявіў, што будзе працаваць з групай "Летонхэдз" толькі на працягу 5 месяцаў.

Усмешка Мэрылін МАНРО

Зараз у Кітаі ідзе рэкламная праграма, у якой на многіх таварах будзе адлюстравана амерыканская зорка Мэрылін Манро.

Ужо заключаны кантракт паміж кітайскай кампаніяй СІТІК і амерыканскім агецтвам Роджэра Рычмана. Адлюстраванне Манро можна будзе ўбачыць на шклянках духоў, дзіцячых цацках, вопратцы і г.д.

Апошнія запісы

У Парыжы выяўлены невядомыя да гэтага часу запісы Джыма Морысана — музыканта папулярнай у мінулым групы "Дорз".

Песні, выкананыя Морысанам пры дапамозе 2-х парыжскіх музыкантаў, датуюцца 1969 і 1971 гг. Мяркуецца, што гэта былі апошнія запісы Морысана.

■

Тыдзень па гараскопу

19–25 верасня

ДЗЕВА

Да серады ўстрымайцеся ад усялякіх падарожжаў: перашкоды і няўдачы. Асцерагайцеся зайздроснікаў. Звярніце ўвагу на здароўе вашых родных.

У другой палове тыдня зможаце дамагчыся жаданага ў бізнесе.

Важныя справы пачніце 22-га і 25-га.

ШАЛІ

Пасля 20-га адчуеце эмацыянальны ўздым і прыліў сіл. Атрымаеце нейкае прыемнае запрашэнне.

Наведайце сваіх сяброў у сярэдзіне тыдня. Магчымы фінансавыя паступленні.

У выхадныя займіцеся спортам. Больш часу праводзіце на свежым паветры.

СКАРПІЁН

На гэтым тыдні ў вас будзе шмат новых знаёмстваў. Перамены ў фінансавай сферы. Асцерагайцеся траўм і крадзяжоў.

Усё важнае для вас пачніце 22-га і 25-га. Палепшыцца становішча ў асабістым жыцці.

СТРАЛЕЦ

Пастарайцеся не сварыцца з каханым у панядзелак. Удзяліце яму больш увагі. Магчымы новыя карысныя для вас знаёмствы. У выхадныя больш часу праводзіце з роднымі.

22-га і 25-га — поспех ва ўсіх вашых пачынаннях.

КАЗЯРОГ

На гэтым тыдні магчыма камерцыйная паездка, у якой вы даможацеся жаданага. Займіцеся творчай дзейнасцю.

Неспакойны раман цалкам запоўніць ваша сэрца і пачуцці. Наперад у атаку 22-га і 25-га.

ВАДАЛЕЙ

У аўторак атрымаеце весткі здалёк, якія зменяць вашы планы. Вам прыйдзецца прыняць нейкае важнае рашэнне.

Спрыяльныя дні 22-га і 25-га.

Будзьце асцярожнымі 20-га і 24-га.

РЫБЫ

Стабілізуецца становішча ў асабістым жыцці і на працы. Да 25-га чакайце перамен у матэрыяльнай сферы.

Фінансавыя праблемы пастарайцеся вырашыць 20-га і 21-га.

Магчымы звесткі або прапановы аб сустрэчы 22—24-га.

АВЕН

Пастарайцеся не пачынаць ніякіх новых спраў на гэтым тыдні. Будзьце асцярожнымі на працы, захоўвайце пачуццё меры.

Лепш не выязджайце ў дарогу ў выхадныя. Не злоўжывайце спіртным і лекамі.

Спрыяльны дзень 22-га.

ЦЯЛЕЦ

Вы пачнеце збіраць плады, пасаджаныя вамі ў маі. Магчымы рамантычныя сустрэчы і захапленні партнёрамі.

Фінансавыя справы вырашайце 25-га.

БЛІЗНЯТЫ

Не адпраўляйцеся ў дарогу 19-га.

20-га ўстрымайцеся ад спіртнога. Будзьце ўважлівымі на дарогах, верагоднасць траўм. Усталююцца добрыя адносіны ў сям'і. Вырашэнне пытанняў аб нерухомасці.

РАК

Магчымы хандра і меланхолія. Змагайцеся з імі. Пастарайцеся не сварыцца з бліжэйшым асяроддзем. Будзьце тактоўнымі і стрыманымі ва ўсім. Устрымайцеся ад вялікіх падарожжаў.

ЛЕЎ

На гэтым тыдні вам лепш не вырашаць ніякіх фінансавых спраў. Займіцеся вашым асабістым жыццём. Павышэнне творчага патэнцыялу. Звярніце ўвагу на сваё здароўе ў выхадныя.

БУДЗЕМ ЗДАРОВЫЯ

"Оптыма" — значыць лепшы

Жыхарка Жодзіна Людміла Іванаўна Драгунова да таго, як звярнулася ў клуб "Аптымаліст", каб скінуць лішнія кілаграмы вагі, перапрабавала мноства дыет, лячылася і галаданнем.

— Не тое, каб зусім нулявым быў вынік, — расказвае яна, — але крыўдна да слёз, што літаральна ў кулак збіраеш волю, прытрымліваешся строгіх правілаў дыет, скідваеш на некаторы час вагу, а яна потым зноў вяртаецца не па днях, а па гадзінах.

Сёння яна — стройная жанчына і ўжо два гады не прыбаўляе ў вазе, прычым, без намаганняў. Нават у мучных стравах сабе не вельмі адмаўляе.

Як так? А проста. У "Аптымаліце" ўздзейнічаюць без усякіх медыкаментаў не на канкрэтны орган, а на свядомасць. Чалавек пераконвае сябе прытрымлівацца простых, зразумелых правілаў жыцця, якія забяспечваюць яму здароўе, не парушаць іх пасля наведвання семінараў, што праводзяцца ў рэспубліканскай школе самааздараўлення імя Г.А.Шычко "Аптымаліст".

Не менш чым 85—90 працэнтаў з тых, хто мае цягу да спіртнога ці тытуню, пасля заняткаў у школе становіцца перакананым непітушчым і не курыць. А многія ж з іх безвынікова спрабавалі пераадолець свае слабасці з дапамогай нарколагаў, і не раз. Уся справа зноў-такі ў тым, што нарколагі далёка не бясшкоднымі лекамі ўздзейнічаюць на страўнік, выклікаючы ў пацыента рвоты рэфлекс на алкаголь і тытунь ці абуджаючы пачуццё страху: табе падшылі антабус, закадзіравалі — не піі, а то памрэш або калекам застанешся. А вось заснавальнік сістэмы аздараўлення "Аптымаліст" ленінградскі вучоны, беларус па паходжанню Г.А.Шычко быў упэўнены: чалавецтва ніколі не вынайдзе лякарства ад алкагалізму, і наркаманіі, таму што ўсе вядомыя метады іх лячэння дзейнічаюць, вобразна кажучы, "на ўзроўні жывата". А трэба ўзнімацца вышэй, уздзейнічаючы на свядомасць і падсвядомасць. Ён распрацаваў сістэму перапраграміравання чалавечай свядомасці з дрэннай прывычкі на процілеглую, калі чалавек не п'е, не курыць, не пераядае не ад страху за сябе, а таму што так настроены, не можа інакш.

Цяпер клубаў "Аптымаліст" у краінах СНД больш за тысячу. Вядучы ў Беларусі сталічны клуб, які паклаў пачатак беларускаму рэспубліканскаму аб'яднанню "Аптымаліст", быў арганізаваны ў 1989 годзе. Кожны, хто прыходзіць сюды, можа прайсці курсы па дзвюх праграмах у залежнасці ад таго, што менавіта перашкаджае яму жыць нармальна — алкаголь, тытунь, лішняя вага, іншыя хваробы ці ўсё гэта разам. На курсах даецца шырокая і праўдзівая інфармацыя аб дзейнасці на арганізм усіх відаў лішкаў, парады, як хутка працаваразіцца, выйсці са стану запою, прыгнечанасці, як перамагчы жаданне закурыць ці паесці. Выконваюцца хатнія заданні ў выглядзе дзённікаў па самааналізу жыцця ў цэлым і кожнага дня пасобку. Абавязкова праводзіцца аўтатрэнінг.

У Японіі кажуць: калі пазваночнік гнуткі — няма захворванняў, калі дух моцны — няма хвароб. Удумайцеся ў гэту фразу — і ўсё вам стане ясна. Здаровы дух мае здаровае цела, а не наадварот, як нам паўтаралі многія гады. Трэба проста кожнаму разабрацца ў сабе, прыслухацца да ўнутранага голасу, даверыцца яму. Бо гэта гаворыць з намі маці-прырода. Яе законы трэба ведаць і выконваць іх. Веды даюць спакой, упэўненасць у будучым дні. І тады з душэўным спакоем прыходзіць і фізічнае здароўе.

Агульнавядома, што нашы клеткі па сваёй энергетычнай магутнасці ў два дзесяткі разоў мацнейшыя за любы вірус, мікроб. Пытанне ў тым, што трэба і пра іх паклапаціцца, зрабіць ім своечасовую "падзарадку". Як тут не ўспомніць пра дыханне. Дыхайце карацей, дыхайце толькі носам. Дыхаць ротам — гэта як есці капусту носам. Цяжка вам, вы раздражнёныя, вас ванітуе пры яздзе ў аўтобусе ці ў час цяжарнасці. Раім удыхнуць паветра з некаторай затрымкай, потым тры частыя ўдыхі і... усмешка шчасця ўпрыгожыць ваш твар, стане лёгка і прыемна.

Вельмі моцнай мабілізуючай уласцівасцю для арганізма валодае ўжо даволі вядомая цяпер сістэма П.К.Іванова, выкладзеная ў яго кнізе "Дзетка". Тут ён рэкамендуе два разы ў дзень аблівацца халодай вадой, хадзіць басанож для зняцця напружання ў арганізме, якім нас узнагароджваюць "прыгожая" сінтэтыка, бетанаваныя памяшканні.

Мне ўспамінаецца Васіль Грыневіч, у якога ў спіне былі такія інтэнсіўныя прыступы болю, што ўрачы прапаноўвалі зрабіць аперацыю. А ён, пазбавіўшыся на семінарах "Аптымаліста" ад шкодных звычак, заняўся асваеннем "Дзеткі". І ў хуткім часе забыўся пра радыкуліт. І дзяцей прывучыў да халоднай вады. Яго дачка Лена з задавальненнем купаецца зімой у палонцы. І такіх прыкладаў у нас многа.

І ўсё ж самым даступным, самым непатрабавальным сродкам па ўзбагачэнню свайго энергетычнага патэнцыялу была і застаецца хадзьба. Мінімальная доза ў суткі — 10 тысяч крокаў. Прывяду станоўчы прыклад гэтай дазіроўкі. У Аляксея Крыўко — адзінокага мужчыны, якому за 40, — атлусценне (вага больш за 130 кг) і звязаныя з гэтым адмоўныя вынікі. Што ён толькі ні перапрабаваў — дыеты, галаданні, перанёс нават аперацыю па выдаленню тлушчавай клятчаткі. Ніякіх вынікаў!

Што рабіць? Аляксей пачаў праходзіць кожны дзень у любое надвор'е ўстаноўленыя 10 тысяч крокаў (каля 7 кіламетраў). І праз год такой трэніроўкі дабіўся выдатнага выніку — вага нармалізавана, здароўе адноўлена.

Адна з самых страшных язваў, якая падточвае чалавека, —забруджанасць арганізма шлакамі. Таму мы вучым ачышчэнню страўніка, кішэчніка, пазбаўленню ад солей, гнуткасці суставаў, галаданню, прытрымліванню пастоў і рацыянальнаму харчаванню.

Мы ідзём у гэтым напрамку з улікам рэальнасці жыцця канкрэтнага чалавека з яго пастаяннай занятасцю, неўладкаванасцю быту, мінімумам сервісу, дэфіцытам прадуктаў і, вядома, часу на асабістую гігіену і фізкультуру. Нашы апрабаваныя, асабіста праверваныя рэкамендацыі даволі простыя, займаюць мала часу, але эфектыўныя. Раскажу пра некаторыя.

Вы прачнуліся. Наперадзе новы, падораны прыродай дзень. Трэба на яго настроіцца. Для гэтага лепшы сродак — напісаць ранішні аўтатрэнінг. Ён зойме не больш як мінуту, але карысці ад гэтага многа. Затым трэба выйсці на вуліцу босым, падыхаць, як рэкамендуе "Дзетка", і абліцца двума вёдрамі халоднай вады. Выцірацца не рэкамендуецца, лепш выканаць некалькі фізічных практыкаванняў. Раніцай яшчэ трэба пачысціць язык, высунуўшы яго як мага больш. Яшчэ раю прамыць ноздры злёгку падсоленай вадой, кожную — тры разы. Асабліва карысная гэта працэдура на ноч. Яна дапаможа вычысціць увесь бруд, які накапіўся за дзень, а дыханне будзе чыстым, што пазбавіць вас ад галаўнога болю.

Добра прамывае наш арганізм вада. Старайцеся ў дзень ужываць яе не менш як 2,5 літра. Пачынайце і заканчвайце дзень шклянкай вады. Ваду з-пад крана можна разнастаіць сярэбранай, крэмніевай, настоенай на лісці розных раслін (парэчак, трускалак, суніц, і інш.) і абавязкова талай.

На здымку: служылі тры таварышы. Сустрэліся, калі кожнаму было па 50 гадоў. У кожнага свой спосаб жыцця. Крайні злева — "аптымаліст". Параўнайце наколькі змяніліся гэтыя твары, зрабіце вывады самі.

Звяртаемся і да такога з даўніх часоў вядомага віду аздараўлення, ачышчання, як урынатэрапія. Людзі даўно карыстаюцца гаючымі сродкамі урыны (з лацінскага — мачавіна). Тыбецкія ламы пілі яе для захавання свайго здароўя, мудрацы Старажытнай Грацыі лячылі воінаў, але асабліва папулярная яна сярод ёгаў, якія называюць яе "вада здароўя". За гэтым народным метадам — вялікая будучыня, таму што дыягназ для урынатэрапіі не мае значэння: Урынатэрапія дае магчымасць пачаць лячэнне нездкладна.

У аптымалістаў правіла: "Выбраўся сам з бездані дурману — дапамажы іншаму". Дапамагаем мы адзін аднаму не толькі парадамі па аздараўленню, але і ў працаўладкаванні, матэрыяльным плане. Арганізуем турыстычныя паездкі, паходы. Дапамагаем знайсці сярод нашых аднадумцаў сабе сяброў, нават спадарожнікаў жыцця. Сустракаемся ў кафэ "Люстэрка", у выхадныя — у раёне Вязынкі Мінскай вобласці.

Многія абывацелі, якія нейкім чынам судакрануліся з укладам жыцця аптымалістаў, лічаць нас нейкай сектай, парадкі ўнутры якой рэзка адрозніваюцца ад агульнапрынятых. У любое надвор'е і зімой, і летам купаемся ў вадаёмах, цікавімся поспехамі і праблемамі адзін аднаго, і не толькі ў сферы аздараўлення. Вольны час стараемся праводзіць сем'ямі, сярод сваіх аднадумцаў. Але ж неспакойны час (а цяперашні — менавіта такі) вельмі цяжка перажыць аднаму. Нават калі адваротны бок жыцця для вас не сакрэт, калі ўпэўнены ў сваіх сілах, па складу натуры не схільны да розных сустрэч. А чалавеку, у якога многа слабасцей у характары, які не вызначаецца здароўем ці поўным кашальком — сёння асабліва цяжка. Тым больш прыемна сустрэць людзей, якім недарэчныя грымасы цяперашняга неспакойнага часу — нішто. І не таму нішто, што яны забяспечаны ў матэрыяльным плане лепш за іншых, проста больш кемлівыя, умеюць, навучыліся знаходзіцца ў стане асаблівага душэўнага камфорту. І свет. І сваё месца ў ім успрымаюць інакш, больш радасна, а не сумна, з упэўненасцю ў сабе, а не з сумненнем.

Б.Сафроненка, В.Талкачоў, правадзейны член Міжнароднай асацыяцыі псіханалітыкаў, заснавальнік рэспубліканскай школы самааздараўлення імя Г.А.Шычко "Аптымаліст".

КРЫНІЦЫ

Сцяпан СЯРГЕЙ

* * *

Разнярэджу,
як рану, душу —
хай баліць,
не дае мне спакою.
Сёння —
каюся, заўтра — грашу,
снег, як сон,
над маёй галавою.

Жыць са
скрухаю вечных трывог —
гэта лёс мой ці Боская воля.
Толькі ранкам
ступлю за парог —
снегам выслана белае поле.

І цягну за сабою свой след,
на халодным
стаю скрыжаванні,
кожны шлях
у нязведаны свет,
ды не кожны —
да выратавання.

І таму я на рызыку й страх
выбраў той, дзе
не будзе спакою...
Зацярушаны зоркамі шлях,
белы снег над маёй галавою.

* * *

Святло пральецца
ў ранішні пакой,
я на світанні
жнівеньскім прачнуся.
Мінае час,
над чорнаю страхой
стамлёна кружыць
белы бусел.
Ніжэюць дні,
і ранкі халадней,
прыцішаны ўспамінам
зорны вечар.
І абрывае лісцікі надзей
з галін жыцця
бяздомны вецер.

Лёс

Уладар мой,
няўлоўны мой лёс,
Не прашу ў цябе лепшай долі.
Знаю добра: у кіпені рос
белы конь мой гуляе на волі.

І нікому яго не злавіць,
ён свабодны і вольны,
як вецер,
белай птушкай
над лугам ляціць
у пранізаны знічкамі вечар.

Мне бывае балюча да слёз,
Я брыду па жыццёвым полі,
ды пакуль ты,
мой косю, на волі,
не ўладар нада мною мой лёс.

9 x 12

Мішэль ЛЕГРАН: "Я ніколі не слухаю Мішэля ЛЕГРАНА"

Мне здаецца, няма такога чалавека, які б хоць раз у жыцці не чуў мелодыю да кінафільма "Шэрбургскія парасончыкі". Няма таго, хто, пачуўшы гэты цудоўны твор, не захапіўся ім адразу і назаўсёды. І хто б не ведаў, што нараджэннем сваім гэтая ўзнёслая музыка абавязана вялікаму кампазітару — Мішэлю Леграну. Што яго натхніла на стварэнне такой мелодыі? Пра гэта, і не толькі, паспрабаваў расказаць шаноўны маэстра, які сёлета быў у Віцебску ў якасці старшыні Міжнароднага журы фестывалю "Славянскі базар"...

— Што натхніла на напісанне "Шэрбургскіх парасончыкаў"? (маэстра задумаўся). Я б сам хацеў ведаць, што мяне натхніла, але, на жаль, я гэтага не ведаю. Так здаралася, што ў трагічныя моманты свайго жыцця я пісаў вясёлую музыку, а ў вясёлыя — трагічную. Адзінае, што я ведаю дакладна і што пастаянна мяне "даймае" — патрэбнасць пісаць музыку. Без гэтага не праходзіць ні адзін мой дзень.

— Ці не азначае Ваш прыезд на «Славянскі базар», што ў Вас ёсць славянскія карані?

— Так, безумоўна, у мяне ёсць славянскія карані. Я лічу, што ва ўсіх сапраўдных музыкантаў ёсць славянская кроў. Таму што ў добрай музыцы павінна прысутнічаць славянская душа. Бацька маёй маці, мой дзядуля, быў армянін, так што я на чвэрць таксама армянін. Я на ўсё жыццё ўлюблёны ў славянскую музыку. Упершыню я прыехаў у Расію ў 1957 годзе, пазнаёміўся з многімі добрымі людзьмі. З таго часу я вельмі люблю Расію, Беларусь, дзе нарадзіўся цудоўны фестываль "Славянскі базар", увогуле люблю славянскую музыку і душу.

— Ваша музыка, спадар Легран, музыка кахання. А што азначае каханне ў Вашым жыцці?

— Мая музыка — гэта, безумоўна, каханне. Што для мяне каханне? Я лічу, што каханне — пачуццё, якое супрацьстаіць нянавісці. Каханне — гэта жыццё, творчасць, дарагія мне людзі. Калі няма кахання — настае смерць.

— Што б Вы маглі сказаць пра французскую папулярную музыку сёння?

— Быў час, калі французскую музыку можна было назваць музыкай кахання, страсці. Гэта быў час, калі і сама Францыя перажывала эпоху кахання. На жаль сёння вялікая колькасць малодых аўтараў аддае перавагу амерыканскай музыцы. На маю думку, яны, гэтыя аўтары, магчыма заробяць шмат грошай, але ў іх няма будучыні.

— А што ў Францыі ведаюць пра славянскую музыку?

— У нас няма поўнага ўяўлення пра музыку славян. Магчыма, толькі класічная музыка нам больш-менш вядома. Але тое, што мы ведаем, нам вельмі падабаецца.

— Быў час, калі бульварныя французскія газеты пісалі, што ў Вас складаныя, калі не сказаць болей, адносіны з «зоркамі» французскай песні Патрысіяй Каас і Шарлем Азнавурам...

— Ведаеце, бульварная прэса таму і завецца бульварнай, што дае неправераную, а часам, патэнцыяльна скандальную інфармацыю. У мяне добрыя адносіны з Патрысіяй Каас, а Шарлю Азнавуру тры месяцы таму я напісаў некалькі песень.

— Хацелася б, каб Вы сказалі некалькі слоў і пра творчае супрацоўніцтва з Тамарай Гвердцытэлі.

— У Тамары выдатны голас, яна цудоўная спявачка. Я спадзяюся, што мы і надалей будзем з ёй працаваць.

— Чаго больш усяго на свеце баіцца «зорка» Легран?

— Я не баюся нічога. Я авантурыст з-за сваёй любві да музыкі. Мае амбіцыі праяўляюцца ў тым, каб існаваць ва ўсіх музычных жанрах.

— Каго б Вы маглі запрасіць да сябе на дзень нараджэння?

— У мяне дома ніколі не адзначаюцца гэтыя каляндарныя даты. Безумоўна, у мяне даволі часта ўзнікае патрэбнасць убачыць людзей, якіх я люблю. Яны прыходзяць да мяне, і мы адзначаем разам усе святы, у тым ліку і дзень нараджэння. А паколькі сябры прыходзяць часта, я магу сказаць, што ў мяне кожны дзень — дзень нараджэння.

— Якія віды мастацтва, акрамя музыкі, Вас яшчэ цікавяць?

— Я вельмі люблю жывапіс, нават сам трохі спрабую гэтым займацца, але, калі шчыра, то не зусім атрымліваецца. Ды і часу няма. Усё забірае музыка...

— Вы шмат працавалі з «зоркай» французскай эстрады Мірэй Мацье. Дзе яна зараз, як складваецца яе творчае жыццё?

— Яна па-ранейшаму ў Францыі. Я вельмі доўга і плённа з ёй працаваў і лічу яе адной з самых выдатных спявачак свету. Але пасля смерці Джоні Старка Мірэй пакінула сцэну. Аднак гэта не значыць, што яна не зможа на яе вярнуцца...

— Ці часта Мішэль Легран слухае ў сябе дома Мішэля Леграна?

— (Смяецца). У мяне дома няма ніводнай кружэлкі з музыкай Мішэля Леграна, ніводнай відэакасеты з запісам фільма, дзе гучыць музыка Мішэля Леграна. І ўвогуле, я ніколі не слухаю Мішэля Леграна. Па той простай прычыне, што калі пачынаеш слухаць свой твор, узнікае жаданне штосьці перарабіць, перапісаць, змяніць. Але гэта ўжо немагчыма. Так што, лепш не слухаць.

— Спадар Легран, ці ёсць у Вас якія-небудзь бліжэйшыя творчыя праекты, звязаныя з краінамі СНД? Напрыклад, гастролі.

— Што тычыцца гастроляў, то яны прадугледжаны ў бліжэйшы час у Японію і ЗША. А наконт праектаў... Мяне папрасіў напісаць музыку да кінафільма "Ціхі Дон" вялікі рускі рэжысёр Сяргей Бандарчук. І ў бліжэйшы час я займуся гэтым.

Майя ШЭНДРЫК.

Крыжаслоў—"Спорт"



Па гарызанталі: 5. Скарасны спуск на лыжах з гары па звілістай дарожцы. 6. Тэрмін у боксе. 9. Кідальны снарад. 10. Горад у Японіі, дзе праходзілі XVIII летнія Алімпійскія гульні. 14. Спартыўная гульня. 15. Стадыён у Наваполацку. 19. Спартыўная камандная гульня з мячом і бітай. 21. Гульня з мячом і ракеткамі на пляцоўцы, раздзеленай сеткай. 22. Прыналежнасць для падводнага віду спорту. 26. Прыз ЦС ДСТ на Усесаюзных спаборніцтвах па футболе сярод дзяцей. 31. Ветэран па футболе Ленінградскага "Зеніта". 32. Рэспубліканскі спартыўны комплекс. 34. Мячык для гульні ў бадмінтон. 35. Заключная частка спартыўных спаборніцтваў, дзе вызначаецца пераможца. 38. Ветэран беларускага футбола. 39. Мінскі лёгкаатлетычны спартыўны комплекс.

Па вертыкалі: 2. Спецыяльная дыстанцыя на стадыёне. 3. Кіраўнік спартыўнай каманды. 5. Спартыўная прылада для гульняў. 7. Спецыяліст для ўдасканальвання спартыўных навыкаў. 11. Спартыўная сетка для скачкоў. 12. Спартыўныя практыкаванні з абручамі. 13. Спартыўны футбольны клуб Італіі. 16. Адзін з трэнераў Мінскага "Дынамо" па футболе. 17. Род футбола на матацыклах. 23. Ганаровае званне спартсмена. 24. Від спартыўнай вопраткі. 25. Спартыўная барацьба. 27. Краіна, у якой папулярны хакей. 28. Адзін з трэнераў зборнай каманды па хакею СССР. 29. Спартсмен, які мае найбольш шанцаў на першынства. 30 Вядомы беларускі лёгкаатлет, алімпійскі чэмпіён.

Па дугах: 1. Спартыўнае таварыства Казахстана. 4. Ніжні этап глядзельнай спартыўнай залы. 8. Від спорта. 18. Беларускі шахматыст, міжнародны гросмайстар, пераможца міжнародных турніраў. 20. Савецкі велагоншчык, які стаў першым алімпійскім чэмпіёнам. 33. Цэнтральны стадыён г.Ерэвана. 36. Футбольная каманда Арменіі. 37. Беларуская спартсменка, алімпійскі чэмпіён па спартыўнай гімнастыцы.

Даслаў В.ПІНЧУК.



КІНУЛА "ЧОРНУЮ ПАМЯЦЬ"

Амерыканская хімічная кампанія "Юніён Карбайд" прадала свае прадпрыемствы, якія знаходзяцца на індыйскай тэрыторыі адной мясцовай кампаніі, і назаўсёды пакінула Індыю. Аднак яна пакінула там пасля сябе чорную памяць.

3 снежня 1984 года на заводзе "Юніён Карбайд" у г. Мадыя Прадэш адбыўся выкід ядавітага газу, у выніку якога больш як 3 тысячы чалавек загінулі і некалькі тысяч засталіся калекамі. У 1988 годзе кампанія заплаціла 81 мільён даляраў кампенсацыі пацярпеўшым.

А ПАЦЯРПЕЛІ ДАМЫ...

У Ірландыі ў г. Дубліне адбыўся выбух на вакзале. Гэты выбух многія разглядаюць як папярэджанне ірландскаму ўраду, які не вырашае пытання паўночнаірландскага канфлікту.

Бомба ўзарвалася на вакзале адразу ж пасля адпраўлення поезда. Ахвяр няма, 2 маладыя дамы атрымалі лёгкія раненні.

ЛІДЭР ПАЛЕСЦІНЫ — АПТЫМІСТ

Міністр фінансаў Ізраіля сустрэўся з лідэрам Палесціны Арафатам.

Сустрача працягвалася 90 мінут. Яе галоўная тэма — асноўныя пастаўшчыкі грошай Палесціне. Нядаўна ў Парыжы адбылася канферэнцыя ў сувязі з гэтай праблемай. 15 дзяржаў выказалі жаданне дапамагчы Палесціне. Імі было выдзелена 5 мільёнаў даляраў. Арафат настроены аптымістычна.

АРАБСКІЯ БУНТАЎШЧЫКІ НА ФРАНЦУЗСКІХ ВУЛІЦАХ

Другую ноч працягваюцца беспарадкі ў французскім горадзе Паўон, размешчаным на паўднёвым захадзе Францыі. Бясчынствуюць тут групы арабскай моладзі, якія помсцяць за забойства аднаго са "сваіх" — мараканца па паходжанню. Ён быў забіты адстаўным ваенным, машыну якога збіраўся ўгнаць. Афіцэр, якому 54 гады, арыштаваны. Сутычкі паміж паліцыяй і пратэстантамі ўсё больш абвастраюцца, паліцыю закідваюць запальнымі бомбамі.

РЭКЛАМУЮЦЬ БУДЫЗМ

Індыйскі ўрад заявіў аб рашэнні прыцягваць як мага больш турыстаў у месцы, звязаныя з будызмам.

Для гэтага будзе пачата будаўніцтва гасцініц непадалёку ад свяшчэнных месцаў. Таксама плануецца правядзенне спецыяльных рэкламных тураў па Японіі, Малайзіі, Сінгапуру і Тайланду.

КВЕБЕК ВЫЗНАЧАЕЦЦА?

4,8 мільёна чалавек прынялі ўдзел у выбарах мясцовага парламента ў канадскай правінцыі Квебек. Згодна з апошнім апытаннем грамадскай думкі, лідзіруе сепаратысцкая партыя Квебека, якая выступае за аддзяленне правінцыі ад Канады.

Кіраўнік гэтай партыі Жак Парызо прапануе правесці перагаворы з федэральным урадам наконт перадачы паўнамоцтваў перш чым пройдзе ўсенародны рэферэндум па пытанню незалежнасці.

ГАНДЛЁВАЯ ВАЙНА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Чарговы раунд перагавораў па гандлі паміж ЗША і Японіяй закончыўся безвынікова. Гандлёвая "мяккая вайна" паміж дзвюма прамысловымі дзяржавамі працягваецца ўжо некалькі месяцаў.

ДЫПЛАМАТЫЯ ВЫЧАРПАНА

Дзяржсакратар ЗША Уорэн Крыстафер у сваім выступленні заявіў, што ўсе мірныя сродкі для вяртання да ўлады законна выбранага прэзідэнта Гаіці Арыстыда вычарпаны. У бліжэйшыя дні ЗША прыме рашэнне аб ваенным уварванні.

ХАТНІ ЭКРАН

17, субота

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Эканамікст.
8.20. Пад купалам Сусвету.
8.30. Надвор'е.
8.40. Пяць хвілін на жарты.
8.50. Здароўе.
◆9.20. "Хуткі поезд".
11.00. Паказвае Магілёў.
11.30. 20 мінут рэдактара.
* 11.50. "Лулу – анёл кветак".
12.25. Гарадкі. Чэмпіянат Еўропы.
13.05. "Бімбат".
◆13.30. "Я родам з дзяцінства".
15.15. Рэпартаж з рок-фестывалю.
* 15.55. "Домік для ўсіх".
16.10. "Першая скрыпка". Народны артыст Беларусі Леў Гарэлік.
17.00. Футбол. Чэмпіянат Беларусі. "Дынамо-93" (Мінск) – КІМ (Віцебск). 2-гі тайм.
17.50. "Полацкая плячатка". Кінанарыс.
* 18.00. "Чарапашкі ніндзя".
18.25. "Падводныя лодкі – акулы са сталі".
18.55. "Нов і К"-топ-10.
19.55. Спартыўныя навіны.
20.25. Пяць хвілін на жарты.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Пад купалам Сусвету.
◆21.45. "Развітальныя гастролі".
23.00. "Каскад".
23.20. Відэльма-нявідзьма.

Канал "Астанкіна"

6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.15. Спорт-шанц.
7.45. Слова пастара. Мітрапаліт Кірыл.
8.00. "Марафон-15" – малышам.
8.30. "Спектр".
8.40. Голас Азіі.
10.00. Я – жанчына.
10.30. Ранішняя пошта.
11.00. Навіны культуры.
11.10. Смак.
11.25. Первадоленне.
◆11.55. "Шукальнікі шчасця".
14.00, 23.00. Навіны.
14.20. Лабірынт. Прыватызацыя ў нас і ў іх.
◆14.50. "Катвізл".
15.20. Грай, гармоніка!
16.10. "Жыццё заапаркаў".
16.50. Фестываль "Ступень да Парнаса".
17.00. Разумнікі і разумніцы.
17.45. Да і пасля.
◆18.35. "Справа аб выкраданні дзіцяці Ліндберга". 2-я серыя.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны плюс.
20.35, 23.10. Надвор'е.
20.45. "Справа аб выкраданні дзіцяці Ліндберга". 3-я серыя.
21.40. Кабарэ "Усе зоркі".
22.25. Магік-шоу.
23.20. Астралябія.
0.10. Аўта-шоу.

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Весткі.
7.45. Студыя "Рост". "Дзень нараджэння Дональда Дака". 2-я частка.
* 8.15. Мульці-пульці.
8.45. Тэлеэрудыт.
9.50. Пілігрым.
9.35. Музыка ўсіх пакаленняў.
10.05. Зваротны адрас.
◆10.55. "Пунсовая кветачка".
12.10. Мір і вайна.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.20. Ізабэль.
14.05. Футбол без граніц.
15.00. Кліп-антракт. Н.Сенчукова.
15.05. Расія распятая.
15.50. Зоркі Амерыкі.
* 18.20. "Вакол свету за 80 дзён".
17.15. Вуснамі дзіцяці.
17.45. Тэлеэрудыт.
17.50. Свята кожны дзень.
18.00. Аншлаг і К°.
◆19.25. "Рукапіс, знойдзены ў Сарагосе".
21.05. Фільм-прэм'ер.
21.25. Зусім сакратна.
22.20. Аўтаімгненне.
22.25. Зоркі гавораць.
22.30. Спартыўная карусель.
22.35. Праграма "А".
◆23.35. "Не хадзіце, дзеўкі, замуж".

Санкт-Пецярбург

9.00. Рэлігійная праграма.
9.30. Чароўная лінія.
◆9.45. "Парфум" (ЗША).
* 11.35. Мультфільмы.
12.10. Фільм-канцэрт.
13.00. Хуткая дапамога.
◆13.30. "Чужая радня".
* 15.10. Мультфільм.
* 15.40. "Марыяна першая".
16.10. Кідайка.
◆16.50. "Кешка і маг".
17.20. Данское казацтва.
18.10. Вялікі фестываль.
18.30, 21.45. Інфарм ТБ.
18.55. Экспрэс-кіно.
◆19.15. "Страсці".
20.50. Жульен Грэко. Канцэрт у зале "Алімпія".
22.05. Ваш стыль.
22.10. "Дом кіно".

8-ы канал

◆15.00. "Жыве такі хлопец".
16.35. Прапаведнік Кенет Коўпленд.
17.05. Музычны фільм.
* 17.50. "Тры кабальера". 3-я частка.
18.30. СОЛТЭК. Спартыўная мазаіка.
19.00. Фірма "Кедберы" і "ММ-4" прадстаўляюць музычную праграму.
20.00. "Пры свечках".
◆20.20. "Вартанне рэзідэнта". 8-я серыя.
21.30. Студыя "БМ". Праграма "На даху".
◆21.50. "Вялікі Шу" (Польшча).

Канал НТВ

* 17.00. Мультфільм.
17.15. Трошке вока.
18.00. "Сёння".
18.35. "Ключы ад форта Баярд". 31-ы вып.
19.55. "Непадведзеныя вынікі".
◆20.25. "Сышчыкі – аматары экстра-класа". 5-я серыя.
21.00. Надоечы.
21.45. Аўтаспорт: вышэйшыя дасягненні.
◆22.00. "Нелюдзь".
* 0.30. Мультфільмы для дарослых.

18, нядзеля

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Пяць хвілін на жарты.
8.30. Слова да чалавека.
9.00. Беларускі тур.
* 9.20. "Чарапашкі ніндзя".
9.45. Нядзельная пропаведзь.
9.55. Аэробіка.
10.25. "MTV. Лепшыя хіты".
10.55. Шашачны клуб.
11.25. Існасць. На фестывалі духоўнай музыкі "Магутны Божа" ў Магілёве.
12.10. Зрабі сабе кар'еру.
12.40. Шматгалоссе. Народы Беларусі.
* 13.30. Мультфільмы.
◆13.45. "Паласаты рэйс".
15.15. "Тры апельсіны".
15.35. Дзелавы веснік.
15.50. Тэлеклуб "Гаў-гаў".
16.20. "Гінес-шоу".
* 16.50. "Чарапашкі ніндзя".
17.15. Тэлекрама.
17.25. "Настальгічны дывертысмент". Гісторыя ДАБТа Беларусі ў асобах.
18.30. Праспект.
19.00. Футбол. Чэмпіянат Беларусі. "Дынамо" (Мінск) – "Дняпр" (Магілёў). 2-гі тайм.
20.00. Панарама.
20.35. Пяць хвілін на жарты.
20.45. Калыханка.
21.05. Пад купалам Сусвету.
◆21.15. "Сінема" прадстаўляе. "Шлюб па-італьянску" (Італія).
23.05. Гонкі для Беларусі.
23.40. Камп'ютэрны палігон.
23.55. "Славянскі базар-94". Ноч з Мішэлем Легранам.

Канал "Астанкіна"

8.00. Марафон-15.
8.30. Раным-рана.
9.00. Палігон.
9.30. Пакуль усе дома.
10.00. Раніцняя зорка.
10.50. Зямля людзям.
11.20. Авіякасмічны салон.
11.40. Люстэрка.
12.20. Малыя гарады Расіі.
12.50. Шпаргалка з падарункам.
13.10. "Падводная адысея каманды Кусто".
14.00, 17.15, 23.00. Навіны.
14.20. Тэлерадыёкампанія "Мір".
15.05. Амерыка з М.Таратутам.
15.35. Вялікі тэатр. Дні і вечары.
16.20. Клуб падарожнікаў.
17.25. Тэлеоцэнка.
17.40. Жывое дрэва рамёстваў.
* 17.45. Мультфільмы (ЗША).
18.40. Бамонд.
18.55. Надвор'е.
◆19.05. "Вялікае мыццё" (Францыя).
21.00. Нядзеля.
21.50. Спартыўны ўік-энд.
22.10. Парад фестываляў. Венецыя.
23.15. Футбол. Чэмпіянат Расіі. "Лакаматыў" (Масква) – "Текстыльшчык" (Камышын). 2-гі тайм.

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00. Весткі.
8.00. Студыя "Рост".
8.30. Добрай раніцы, Еўропа!
9.00. Правінцыяльныя пісьмы.
9.30. "Пад"-галерэя.
10.00. Аты-баты...
10.30. Здарова жывеш.
10.45. "Абдуладжан, ці Прысвячэнне Стывену Спілбергу".
12.15. Шостае пачуццё.
12.40. Шасць сотак.
13.20. Не высечы...
13.40. У цені манастырскіх сцен.
14.10. Зброя і закон.
14.35. Ротра-шлягер.
15.05. Узлёт і падзенне Джудзі Гарланд.
15.35. У свеце жывёл.
16.30. Каробка перадач.
16.45. Свята кожны дзень.
* 17.00. Чароўны свет Дыснея.
18.00. "Дзень нараджэння". Канцэрт Эдзіты П'ехі.
◆19.25. "Рукапіс, знойдзены ў Сарагосе".
21.25. У Ксюшы.
22.20. Аўтаімгненне.
22.25. Зоркі гавораць.
22.30. Спартыўная карусель.
22.35. Поўня.

Санкт-Пецярбург

9.00. "Гаючае слова". Праграма-набажэнства.
* 9.30. "Клемяціна".
10.00. Экспрэс-кіно.
◆10.15. "Асенняя дарога да мамы".
11.00. Нядзельны лабірынт.
12.30. Сем сланоў.
13.00. "Казачнае падарожжа Більбо Бегінса Хабіта". Спектакль для дзяцей.
* 14.05. Мультфільмы.
14.20. Залаты ключ.
14.30. Хохін круіз.
14.55. "Марыя Сцюарт". Опера.
16.15. Гістарычны альманах.
17.00. Чэмпіянат Італіі па футболе.
18.50. Харэаграфія Марыса Бежара.
19.20. Тэлетэкст.
19.30. Інфарм ТБ.
◆19.55. "Тайна".
22.15. Ваш стыль.
22.20. Адамаў яблык.

8-ы канал

◆15.00. "Шчаня".
16.40. "Спартак": дзеючыя асобы і выканаўцы.
* 17.10. Мультфільмы.
17.40. "Асабістая справа Ганны Ахматавай".
18.45. Інтэрв'ю.
19.15. СОЛТЭК. Пік.
◆19.50. "Канец аперацыі "Рэзідэнт". 7-я серыя.
21.00. Студыя "БМ". Праграма дайджэст.
◆21.20. "Канец аперацыі "Рэзідэнт". 8-я серыя.
22.30. Foxy music.

Канал НТВ

◆17.00. "Няўлоўныя мсціўцы".
18.25. Тэлечасопіс "Планета мод".
* 19.00. "Піф-паф, оё-оё-оё".
◆19.20. "Сышчыкі – аматары экстра-класа". 6-я серыя.
20.00. Вынікі.
◆21.10. "Выгубы Місуры".
23.20. Рэмра-ТБ: КВЗ-89.
1.05. НТВ прадстаўляе: анонс тыдня.

19, панядзелак

Беларускае тэлебачанне

9.05. Дзелавы веснік.
9.20. Пад купалам Сусвету.
9.30. Пяць хвілін на жарты.
* 9.40. "Чарапашкі ніндзя".
10.05. Тэлеклуб "Гаў-гаў".
◆10.35. "Камураска".
12.35. "Трыццаць шэсць радасцей". Тэл.д/ф.
13.35. "Танцуе Людміла Семяняка". Фільм-канцэрт.
◆14.30. "Некалькі дзён з жыцця І.І.Абломава".
16.50. Тэлебачанне – школе. Музыка. Цудоўная палітра жыцця.
17.10. "Бімбат".
17.30. Навіны.
17.40. "Сніўся мне сад". Кінанарыс.
17.50. Беларускі тур.
18.10. Абласныя навіны (Брэст).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Аэробіка.
19.30. Праспект.
20.00. "У стылі джаз-рэтра".
20.20. Пяць хвілін на жарты.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.35. Студыя "Талесябрына".
21.40. Спартыўны тэлекур'ер.
22.00. Дзень беларускага пісьменства і друку.
22.45. Пад купалам Сусвету.
22.55. НІКа.
23.10. Надвор'е.
◆23.20. "Паласа Сімарана".

Канал "Астанкіна"

17.00, 20.00, 23.15. Навіны.
17.25. Свет сёння.
17.40. Азбука ўласніка.
17.50, 20.35. Надвор'е.
18.00. Гадзіна пік.
◆18.25. "Дзікая Роза".
18.55. Мужчына і жанчына.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.45. Гол.
21.15. "Трагікі і камедыянты". Фільм-спектакль.
23.30. Максіма.
24.00. Прэс-экспрэс.
0.10. Палітра.

Канал "Расія"

6.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00. Весткі.
8.00. Сусветныя навіны Эй-бі-сі.
8.30. Зваротны адрас.
◆9.00. "Апошні патрон".
10.25. Кліп-антракт. Парк Горкага.
10.35. Тэлегазета.
10.40. Сялянскае пытанне.
* 15.20. "Фанцік. Першабытная казка", "Заечая лазня".
15.50. Там-там навіны.
16.05. Новая лінія. "Паволжа".
16.35. Формула бяспекі.
16.50. Бізнес у Расіі.
17.20. Свята кожны дзень.
17.30. Выратаванне 911.
18.25. Наш сад.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Каробка шакаладных цукерак".
20.35. Рэпарцёр.
20.50. Нікто не забыты.
21.00. Момант ісціны. На пытанні А.Каравулава адказвае В.Віленкін.
22.20. Аўтаімгненне.
22.25. Зоркі гавораць.
22.30. Спартыўная карусель.
22.35. Экран крымінальных паведамленняў.
22.45. Футбол. "Спартак" (Масква) – "Лада" (Тальяці)

Санкт-Пецярбург

17.05. "Рыцар забытай прыгажосці". Д/ф.
18.10. Вялікі фестываль.
18.30, 21.45. Інфарм ТБ.
18.50. Спорт, спорт, спорт..
◆19.05. "Каміла, ці Нераскрытыя таямніцы".
20.05. "Грыбы". Прэм'ера "Лентелефільма".
20.15. Песні кахання. Сплавае Марыя Кадрану.
20.45. Тэлеклуб бяспекі.
20.55. Свет мастацтва.
21.25. Тэлемагазін.
21.30. Па ўсёй Расіі.
22.00. Спартыўныя навіны.
22.15. Ваш стыль.
◆22.20. "Клапатун, ці Справа майстра баіцца".

8-ы канал

* 18.00. Мультсерыял "Д'Артаньгаў і тры сабакі-мушкецёры".
18.45. Восеньскія сустрэчы.
* 19.05. "Рок ку-ка-рэ-ку". Частка 1-я.
19.45. Пры свечках.
19.50. Гарадскі гадзіннік.
◆20.10. "Салярыс", 1-я серыя.
21.30. Студыя "БМ". Чалавек тыдня.
21.50. Праграма для жанчын "Наталі".
22.25. Foxy music.

НТВ

* 17.05. Мультфільм.
17.30. "Энцыклапедыя цудаў, або Вы хацелі пра гета даведацца".
18.00, 21.00. Сёння.
18.35. Міжнародны турнір па хуткіх шахматах.
◆19.15. "Чужой крывёю" (Францыя-Італія- Канада).
◆21.35. "Комікі", 1-я серыя. (Вялікабрытанія).
22.35. Часінка.
23.05 Тэніс у поўнач.

20, аўторак

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Надвор'е.
8.30. Пяць хвілін на жарты.
* 8.40. "Кацяня Філя І..." "Далёка-далёка на поўдні".
9.00. Тэлебачанне – школе. Музыка. Цудоўная палітра жыцця.
◆9.20. "Паласа Сімарана".
◆10.35. "Крымінальны талент".
13.10. "Бімбат".
◆13.30. "Мілы, дарагі, каханы, адзіны".
* 14.35. "Траяляная пастачка".
14.50. Праграма перадач.
14.55. "Нов і К"-топ-10.
15.55. Тэлебачанне – школе. Беларуская літаратура.
* 16.35. "Брэменскія музыкі", "Па слядах брэменскіх музыкаў".
17.15. "Бімбат".
17.30. Навіны.
17.40. "У вялікім цёмным, дрымучым лесе". Тэл. д/ф.
18.10. Абласныя навіны (Віцебск).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Эканамікст.
19.10. Эканамічная хваля.
19.55. Юзуфоўскія пакуты, альбо "Што можа сельскі Савет.
20.20. Пяць хвілін на жарты.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
◆21.35. "Маё каханне, мой смутак".
22.35. Пад купалам Сусвету.
22.45. Дзень беларускага пісьменства і друку.
23.30. НІКа.
23.45. Надвор'е.
23.55. Рок па вакацыях.

Канал "Астанкіна"

7.00, 9.50, 15.00, 17.00, 20.00, 23.30. Навіны.
8.00. Агляд рынку нерухомасці.
◆8.15. "Дзікая Роза".
9.10. Амерыка з М.Таратутам.
9.40. Справа.
10.00. Дасмісолька.
* 15.25. "Вайна гобатаў".
15.50. Наш музычны клуб.
16.05. Джэм.
16.40. За кулісамі. Кіеў: шанц для росквіту.
17.20. Чакайце адказу.
17.50, 20.35. Надвор'е.
18.00. Гадзіна пік.
◆18.25. "Дзікая Роза".
18.55. Тэма.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.45. З першых рук.
20.55. Песня-94.
◆21.40. "Адзіная дарога".
23.45. Бумеранг.
0.15. Праграма "Х".
0.30. Прэс-экспрэс.

Канал "Расія"

6.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00. Весткі.
8.00. Сусветныя навіны Эй-бі-сі.
8.25. Раніцні канцэрт.
8.45. Момант ісціны. На пытанні А.Каравулава адказвае В.Віленкін.
9.40. "К-2" прадстаўляе: "Пашалунак у дыяфрагму".
10.35. Тэлегазета.
10.40. Сялянскае пытанне.
15.20. Музычны клас.
15.50. Там-там навіны.
16.05. Новая лінія. "Курсіў".
16.35. Дзеля блізкага свайго.
16.50. Кліп-антракт Н.Плаціцына.
16.55. Не быць дыназаўрам.
17.10. Фільм-прэм'ер.
17.25. Свята кожны дзень.
17.35. Астралогія кахання.
18.10. L-клуб.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Адзін дзень у судзе".
21.30. Я – лідэр.
22.20. Аўтаімгненне.
22.25. Зоркі гавораць.
22.30. Спартыўная карусель.
◆22.35. "Ягады на Алясцы".

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.45. Інфарм ТБ.
12.10. Чароўная лінія.
12.25. "Нямецкая хваля".
13.00. Хуткая дапамога.
◆13.30. "Каміла, ці Нераскрытыя таямніцы".
14.25. "Дзень нараджэння".
◆14.45. "Аб тым, чаго не было".
◆16.05. "Па следу белага фургона".
17.10. "Там, дзе жыве Павушніч".
* 17.25. Мультфільм.
17.40. Ваша права.
18.10. Вялікі фестываль.
18.50. Спорт, спорт, спорт...
◆19.05. "Каміла, ці Нераскрытыя таямніцы".
20.05. "Грыбы". Прэм'ера "Лентелефільма".
20.15. "Русь моя". Фільм-канцэрт.
20.45. Тэлеслужба бяспекі.
20.55. Аранж ТБ: "Страказа".
21.25. Тэлемагазін.
21.30. Будні.
22.00. Спартыўныя навіны.
22.15. Ваш стыль.
22.20. "Вы помніце..."

8-ы канал

* 18.00. Мультсерыял "Д'Артаньгаў і тры сабакі-мушкецёры".
18.30. Студыя "ІНТЭКС". Навіны.
18.45. БАНТ. Рэпартаж.
* 18.50. "Рок ку-ка-рэ-ку". Частка 2-я.
19.10. Кірмаш.
19.40. Пры свечках.
19.45. Шанц-прыз.
◆20.00. "Салярыс". 2-я серыя.
21.30. Студыя "БМ". Арт-панарама.
◆21.50. "Тры сябры".

НТВ

* 17.00. Мультфільм.
17.30. "Энцыклапедыя цудаў, або Вы хацелі пра гета даведацца".
18.00, 21.00. Сёння.
18.35. Уладзімір Співакоў і "Віртуозы Масквы".
◆19.15. Свет кіно. "Брава, лялька!" (Італія)
◆21.35. "Комікі", 2-я серыя.
22.35. Часінка.
23.05. Шоу-канцэрт "Васільеўскі спуск-94".

21, серада

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Надвор'е.
8.30. Пяць хвілін на жарты.
* 8.40. "Карлсан вяртаўся".
9.00. Тэлебачанне – школе. Беларуская літаратура.
◆9.35. "Маё каханне, мой смутак".
10.35. "Анюта". Фільм-балет.
11.45. "Карамболь". Ток-шоу з удзелам народнага артыста Беларусі А.Ярмоленкі.
12.15. Тэлефільмы.
13.05. "Бімбат".
* 13.25. "Як лісы з курамі пасябравалі" і інш.
◆13.55. "Жорсткі раманс".
16.20. Як нараджаецца музыка? Хормайстар Таццяна Валошына.
17.10. "Бімбат".
17.30. Навіны.
17.40. "Голас". Фільм-канцэрт.
18.10. Абласныя навіны (Гомель).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. "Карамболь". Ток-шоу з удзелам народнага артыста Беларусі А.Ярмоленкі.
19.30. Гаспадар. Дзе выйсце з крызісу?
20.10."Крэда" Праграма для дзелавых людзей.
20.30. Пяць хвілін на жарты.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
◆21.35. "Маё каханне, мой смутак".
22.35. Кантакт.
22.40. Пад купалам Сусвету.
22.50. Аўта-парк.
23.10. НІКа
23.25. Надвор'е.

Канал "Астанкіна"

7.00, 9.50, 15.00, 17.00, 20.00, 23.25. Навіны.
8.00. Расійскі дайджэст.
◆8.20. "Дзікая Роза".
8.50. Клуб падарожнікаў.
9.40. Дзелавы веснік.
10.00. Пагладзі, паслухай...
* 15.25. "Вайна гобатаў".
15.50. Камп'ютэр-хол.
16.05. Адказы.
16.40. Тэлерадыёкампанія "Мір".
17.25. Свет сёння.
17.40. Тэхнадром.
17.50, 20.35. Надвор'е.
18.00. Гадзіна пік.
◆18.25. "Дзікая Роза".
18.55. "Парвалі парус... Вечар памяці У.Высоцкага.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.45. Сустрэча з А.І.Салжаніцыным.
◆21.05. "Вуліцы Сан-Францыска".
22.05. "Погляд" з А.Любімавым.
23.10. Музагляд.
24.00. Прэс-экспрэс.

Канал "Расія"

6.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00. Весткі.
8.20. Патрабуюцца... патрабуюцца...
8.30. Формула-730.
7.00. Час дзелавых людзей.
7.30. Музыка ўсіх пакаленняў.
8.00. Сусветныя навіны Эй-бі-сі.
8.25. Паехалі.
◆8.35. "Санта-Барбара".
9.25. Відэапазэія.
9.35. Кліп-антракт. Патрысія Квас.
9.40. У свеце жывёл.
10.35. Тэлегазета.
10.40. Сялянскае пытанне.
12.00. Кубак Дэвіса. Паўфінал. Расія – Германія. Трансляцыя з Гамбурга.
15.20. Дзіцячы тэлевізійны тэатр. "Драўляны рыцар". Частка 3-я.
15.50. Там-там навіны.
16.05. Новая лінія.
◆16.50. Дыснеі па пятніцах. "Яшчэ не чалавек-2". 2-я серыя.
17.45. Нікто не забыты.
17.55, 19.25. Чэмпіянат Расіі па футболе. "Дынамо" (Масква) – "Спартак" (Масква).
18.50. Падрабязнасці.
◆20.10. "Сэнта-Барбара".
21.05. "К-2" прадстаўляе: "Абзац".
22.20. Аўтаімгненне.
22.25. Зоркі гавораць.
22.30. Спартыўная карусель.
22.35. Кубак Дэвіса. Паўфінал. Расія – Германія.
23.05. Горкі парк: Лос-Анжэлес – Масква.

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.45. Інфарм ТБ.
12.10. Чароўная лінія.
12.25. "Нямецкая хваля".
13.00. Хуткая дапамога.
13.30. "Казкі Гофмана". Фільм-балет.
* 14.15. "Капрызны Мурад".
14.25, 21.35. Тэлемагазін.
14.45. "Мае сучаснікі".
15.45. Казка за казкай.
◆16.30. "Эзоп".
18.10. Вялікі фестываль.
18.50. Спорт, спорт, спорт...
◆19.05. "Залатое цяля".
20.40. Тэлеслужба бяспекі.
20.50. Канцэрт Жульен Грэко ў зале "Алімпія".
22.00. Спартыўныя навіны.
22.15. Ваш стыль.
22.20. Хакей. Кубак МХЛ

8-ы канал

* 18.00. "Д'Артаньгаў і тры сабакі-мушкецёры".
18.30. СОЛТЭК. Навіны.
18.40. Нямецкая хваля.
19.10. Ці правяраліся вы на СНІД?
* 19.30. "Рок ку-ка-ра-ку". Частка 3-я.
19.45. Дамашні ўрач.
20.05. Пры свечках.
20.10. Гарадскі гадзіннік. Навіны.
◆20.25. "Сталкер", 1-я серыя.
21.30. Студыя "БМ" Фан-клуб. Канцэрт "Рок на вакацыях".
◆21.50. Ліга Вентура ў мастацкім фільме "Алошняе вядомае месца жыхарства".

НТВ

* 17.00. Мультфільм. 17.30. "Энцыклапедыя цудаў, або Вы хацелі пра гета даведацца".
18.00, 21.00. Сёння.
18.35, 1.00. Тэніс. Кубак Дэвіса.
◆19.10. "Ля возера" 1- я серыя.
◆21.35. "Комікі". 5-я серыя.
22.35. Часінка.
◆23.10. "Мроі кахання" (ЗША)..

22, чацвер

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Надвор'е.
8.30. Пяць хвілін на жарты.
* 8.40. "Крэда". Праграма для дзелавых людзей.
◆9.00. "Маё каханне, мой смутак".
10.00. Навукова-папулярныя фільмы.
10.55. "Сільфіда". Фільм-балет.
◆11.25. "На досыпку".
12.45. "У гарах Урала". Тэл.д/ф.
13.00. "Бімбат".
◆13.20. "Няхай я памру, Божа..."
14.35. "Такія розныя клоўны".
15.30. Тэлебачанне – школе. Беларуская літаратура.
◆16.05. "Саўраска".
17.10. "Бімбат".
17.30. Навіны.
* 17.40. "Вогнік" і інш.
18.10. Абласныя навіны (Гродна).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Зачынайце маё пісьмо...
19.05. Стоп-кадр. Крымінальная хроніка.
19.25. Родныя слова. Тэлечасопіс.
19.55. Навошта дадзена ўлада? Праблемы сацыяльнай абароны маламаёмых. Фрунзенскі раён г.Мінска.
20.30. Пяць хвілін на жарты.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
◆21.35. "Маё каханне, мой смутак".
22.35. Кантакт.
22.40. Пад купалам Сусвету.
22.50. "Крок".
23.20. НІКа.
23.35. Надвор'е.
23.45. "Наўшлус". Праграма для аматараў турызму і адпачынку.

Канал "Астанкіна"

7.00, 9.50, 15.00, 17.00, 20.00, 23.25. Навіны.
8.00. Агляд рынку нерухомасці.
◆8.20. "Дзікая Роза".
8.50. У свеце жывёл.
9.30. Прадпрымальнік.
9.40. Выступае ансамбль "Мазуры" (Украіна).
* 10.00. "Салавей".
* 15.25. "Вайна гобатаў".
* 15.50. Мульшітролія.
16.05. ...Да 16 і старэйшым.
16.40. Планета. Харкаў: шанц для росквіту.
17.20. Загадка СБ.
17.40. Знак пытання.
17.50, 20.30. Надвор'е.
18.00. Гадзіна пік.
◆18.25. "Дзікая Роза".
18.55. Кінозорка. А.Дэлон.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.40. Масква-Крэмль.
21.00. Лато "Мільён".
◆21.36. "Крысіна" (Францыя).
23.35. Закрыццё фестывалю "Кінашок-94".
0.10. Прэс-экспрэс.

Канал "Расія"

8.00. Сусветныя навіны Эй-бі-сі.
8.25. Паехалі.
◆8.35. "Санта-Барбара".
9.25. Музыка будзіць планам. Л.Бетховен. "4-я сімфонія".
10.00. "Старажытная Русь. XIV стагоддзе". Д/ф.
* 10.25. "Чужое свята".
10.35. Тэлегазета.
10.40. Сялянскае пытанне.
15.20. Дзіцячы тэлевізійны тэатр.
15.50. Там-там навіны.
16.05. Новая лінія. "Зрабі дабро".
16.50. М-трэст.
17.05. Будні.
17.45. Свята кожны дзень.
17.55. У свеце жывёл- і мотаспорту.
18.25. Свая гульня.
19.25. Падрабязнасці.
◆19.35. "Санта-Барбара".
20.25. Пяць хвілін аб добрым жыцці.
20.30. Бясшумныя лідэры.
21.05. А.Шырвінт. "Маё жыццё ў мастацтве і па-за..."
22.20. Аўтаімгненне.
22.25. Зоркі гавораць.
22.30. Спартыўная карусель.
22.35. "Пецярбургскія сезоны". Музычны фестываль.

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.45. Інфарм ТБ.
12.10. Чароўная лінія.
12.35. "Нямецкая хваля".
13.00. Хуткая дапамога.
◆13.30. "Сінюшчын калодзеж".
13.45. Урок нямецкай мовы.
14.00. Еўрапейскі калейдаскоп.
◆14.45. "Чужая радня".
16.25. "Амарская лука". Д/ф.
18.45. Па сакрэту ўсяму свету.
16.55. Тры колы, фаліянт і...
* 17.15. "Добры лес".
17.30. Парады садаводам.
17.40. Этнасы Зямлі.
18.10. Вялікі фестываль.
18.50. Спорт, спорт, спорт...
* 19.05. "Вялікі налёт".
◆19.15. "Залатое цяля". 1-я серыя.
20.35. "Грыбы".
20.45. Тэлеслужба бяспекі.
20.55. Варыяцыі на балетныя тэмы.
21.25. Тэлемагазін.
21.30. Па ўсёй Расіі.
22.00. Спартыўныя навіны.
22.15. Ваш стыль.
22.20. "Вячэрні звон". Музычны канал.

8-ы канал

* 18.00. "Д'Артаньгаў і тры сабакі-мушкецёры".
18.30. Радаслоўная рускай кухні.
19.00. "Пыгоды вялікага мышаняці-шпіка". Частка 1-я.
19.30. Пры свечках.
◆19.40. "Сталкер" 2-я серыя.
21.15. Да ведама.
21.30. Студыя "БМ" "Квадракола". Праграма-авангард.
◆21.50. "Злачынства ў імя парадку".

НТВ

* 17.00. Мультфільм.
17.30. "Энцыклапедыя цудаў, або Вы хацелі пра гета даведацца".
18.00, 21.00. Сёння.
18.35. Такое спартыўнае жыццё.
◆19.10. "Ракавая красуня" (ЗША).
21.35. "Комікі". 4-я серыя.
22.35. Часінка.
◆23.10. Кіно не для ўсіх.

23, пятніца

Беларускае тэлебачанне

8.00. Раніца рэспублікі.
8.10. Пад купалам Сусвету.
8.20. Надвор'е.
8.30. Слова да чалавека.
9.00. Беларускі тур. Падарожжы, сустрэчы, адпачынак.
◆9.20. "Тайны сім'і да Граншан".
10.20. Нядзельная пропаведзь свяшчэнніка Георгія Латушкі.
* 10.30. "Чарапашкі ніндзя".
10.55. Дайнова-інвест. "MTV. Лепшыя хіты".
11.25. Аэробіка. Урокі Наталлі Назажылавай.
11.55. АВС-клуб. Англійскую мову вучым самі.
12.15. Існасць. Духоўна-рэлігійная праграма.
12.50. "Адрасы набраўшыя".
16.50. "Знайсці сябе". Святлана Чэчка: трэба верыць у жыццё.
17.10. "Бімбат".
17.30. Навіны.
17.40. Мотакрос. Кубак нацыі.
18.10. Абласныя навіны (Магілёў).
18.25. Навіны Бі-бі-сі.
19.00. Эканамікст.
19.10. Рок-аўленд-шоу.
20.10. Студыя "Талесябрына".
20.20. Пяць хвілін на жарты.
20.30. Кантакт.
20.35. Калыханка.
21.00. Панарама.
◆21.35. "Кароткія сустрэчы".
23.15. Пад купалам Сусвету.
23.25. НІКа.
23.40. Надвор'е.
23.50. "Я + Я". Мужчына і жанчына.

Канал "Астанкіна"

7.00, 9.50, 15.00, 17.00, 20.00, 23.00. Навіны.
8.00. Новы старт.
8.15. Сарока. Дзіцячая інфармацыйная праграма.
◆8.40. "Дзікая Роза".
9.10. Экслібрыс.
9.40. Бізнес-клас.
10.00. Канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага рускага народнага аркестра імя М.Осіпава.
◆15.25. "Казка пра Зорнага хлопчыка".
16.35. Чэмпіянат свету па кальцавых матагонках.
16.50. Азбука ўласніка.
17.25. Чалавек і закон.
17.55, 20.35. Надвор'е.
18.00. Чалавек тыдня.
◆18.20. "Дзікая Роза".
18.50. Поле цудаў.
19.40. Добрай ночы, малышы!
20.45. Сустрэча з А.І.Салжаніцыным.
◆21.05. "Вуліцы Сан-Францыска".
22.05. "Погляд" з А.Любімавым.
23.10. Музагляд.
24.00. Прэс-экспрэс.

Канал "Расія"

6.00, 11.00, 15.00, 19.00, 22.00. Весткі.
8.20. Патрабуюцца... патрабуюцца...
8.30. Формула-730.
7.00. Час дзелавых людзей.
7.30. Музыка ўсіх пакаленняў.
8.00. Сусветныя навіны Эй-бі-сі.
8.25. Паехалі.
◆8.35. "Санта-Барбара".
9.25. Відэапазэія.
9.35. Кліп-антракт. Патрысія Квас.
9.40. У свеце жывёл.
10.35. Тэлегазета.
10.40. Сялянскае пытанне.
12.00. Кубак Дэвіса. Паўфінал. Расія – Германія. Трансляцыя з Гамбурга.
15.20. Дзіцячы тэлевізійны тэатр. "Драўляны рыцар". Частка 3-я.
15.50. Там-там навіны.
16.05. Новая лінія.
◆16.50. Дыснеі па пятніцах. "Яшчэ не чалавек-2". 2-я серыя.
17.45. Нікто не забыты.
17.55, 19.25. Чэмпіянат Расіі па футболе. "Дынамо" (Масква) – "Спартак" (Масква).
18.50. Падрабязнасці.
◆20.10. "Сэнта-Барбара".
21.05. "К-2" прадстаўляе: "Абзац".
22.20. Аўтаімгненне.
22.25. Зоркі гавораць.
22.30. Спартыўная карусель.
22.35. Кубак Дэвіса. Паўфінал. Расія – Германія.
23.05. Горкі парк: Лос-Анжэлес – Масква.

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.45. Інфарм ТБ.
12.10. Чароўная лінія.
12.25. "Нямецкая хваля".
13.00. Хуткая дапамога.
13.30. "Казкі Гофмана". Фільм-балет.
* 14.15. "Капрызны Мурад".
14.25, 21.35. Тэлемагазін.
14.45. "Мае сучаснікі".
15.45. Казка за казкай.
◆16.30. "Эзоп".
18.10. Вялікі фестываль.
18.50. Спорт, спорт, спорт...
◆19.05. "Залатое цяля".
20.40. Тэлеслужба бяспекі.
20.50. Канцэрт Жульен Грэко ў зале "Алімпія".
22.00. Спартыўныя навіны.
22.15. Ваш стыль.